بسم الله الرحمن الرحيم

# БАЙРАМ

## Татары на зямлі Беларусі

**Выпуск № 48**

Мінск

2022

“Байрам” – друкаванае выданне беларускіх татараў. Часопіс заснаваў выбітны беларускі энцыклапедыст Якуб Адамавіч Якубоўскі, вялікую ролю ў яго выданні адыгрываў слынны гісторык Ібрагім Барысавіч Канапацкі. З 1991 по 2002 г. свет пабачылі 42 нумары, якія адраз паднялі беларускае татаразнаўства на высокі ўзровень.

Часпіс адноўлены пасля доўгага перапынку ў 2014 г. Тэматыка часопіса – гісторыя, культура і рэлігійнае жыццё татарў-мусульман на землях былога Вялікага Княства Літоўскага. Апошнія гады тэматыка пашыраецца, былі дададзены матэрыялы, якія тычацца розных аспектаў ісламскай культуры і этыкі. Разлічана на тых, хто цікавіцца жыццём татараў, а таксама рэлігіяй Іслам.

Рэдакцыйная рада: Максат Авезаў, Сяргей Міскевіч, Давуд Радкевіч.

Карэктура: Аміня Хасяневіч, Бекір Мурзіч, Давуд Радкевіч.

Дызайн вокладкі: Максат Авезаў.

# Змест

ПРАДМОВА ..... 5

ПЕРАКЛАД КУР'АНА ..... 6

Сура 2. Аль-Бакара (Карова) ..... 6

Сура 3. Алю Імран (Род Імрана) ..... 8

СЛОЎНІК БЕЛАРУСКІХ ТАТАРАЎ ..... 16

ИСТОРИЯ ТАТАРСКИХ ПОСЕЛЕНИЙ НА РЕКЕ ВАКА ..... 26

КУЛЬТАВАЯ АРХІТЭКТУРА МУСУЛЬМАН НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ (XIV – XIX СТСТ.) ..... 33

ЕДИНСТВО В РАЗНООБРАЗИИ (О СЛЕДОВАНИИ МАЗХАБУ) ..... 36

Современная ситуация: основные течения и школы ..... 36

Причины формирования мазхабов ..... 37

Зачем нужен мазхаб? ..... 40

История с немытыми ногами ..... 41

КРИТЕРИИ ПРАВИЛЬНОГО ИСЛАМА ..... 44

ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА ..... 50

Гісторыя пра Сябіта ..... 50

Пра ўдзячнасць ..... 53

Пра маральныя вартасці ..... 53

Роздум над старонкамі Кур'ана ..... 53

АЛІШЭР НАВАІ. УЛЮБЁНЫ СЭРЦАЎ ..... 54

Аб шлюбным жыцці і жанчынах ..... 54

Аб крывадушных шэйхах ..... 56

Аб гуляках ..... 56

Аб дэрвішах-суфіях ..... 57

РАЗДЗЕЛ ДРУГІ. ПРА ДОБРЫЯ УЧЫНКІ І ДРЭННЫЯ ЯКАСЦІ ..... 58

1. Аб пакаянні ..... 58

Аповяд пра раскаянага грэшніка ..... 59

2. Аб падзвіжніцтве ..... 59

Аповяд пра падзвіжніка Шамс ад-Дзіна ..... 60

3. Аб спадзяванні на Бога ..... 60

Аповяд пра спадзяванне паломнікаў ..... 61

4. Аб задаволенасці малым ..... 62

Аповяд пра шэйха, які задавольваўся малым ..... 63

ГОСЦЬ НОМЕРА – АБДУЛЛА МАГОМЕДОВ ..... 64

Почему рождаются инвалиды? ..... 64

Почему же Всевышний создал конкретного человека инвалидом?.....65
**Мудрость истории, произошедшей между пророками Мусой и Хизри (мир им)**.....65
**Жадность, которая привела к щедрости**.....67
**СОРАК ХАДЗІСАЎ У АПАВЯДАННЯХ**.....68
**ГАДАР**.....68
**ПРЫВІД**.....69

## ПРАДМОВА

*Ас-саляму алейкум ва рахмату-Ллагі ва баракятуг!*

Вітаем вас на старонках чарговага нумара часопіса “Байрам”, шаноўныя сябры!

За год, які мінуў ад папярэдняга выдання нашага часопіса, адбыўся шэраг важных падзей. Але ні сацыяльныя, ні палітычныя, ні матэрыяльныя складанасці не перашкодзілі нам працягваць тую важную для нашай краіны і нашага народа справу. Бо адраджэнне – гэта няспынны рух наперад, які вымагае значных высілкаў і цярпення. Муфціят Мусульманскага рэлігійнага аб’яднання ў Рэспубліцы Беларусь не толькі працягвае адукацыйны працэс, выхоўваючы і навучаючы новае пакаленне мусульман не толькі на занятках нядзельных школ, на занятках для студэнтаў і ў летніку-мухайеме (які быў адноўлены ў мінулым годзе), але і адкрываючы новыя накірункі работы: вучоба кадраў для актыва суполак, відэа- і аўдыя-ўрокі. Асобныя вобласці былі створаны ўпершыню – гэта тэлеперадача “Салям алейкум, Беларусь!”, якая ідзе на 8 канале і інтэрнет-радыё “На волне веры” (volnaveri.by), пачаў больш актыўна развівацца канал нашага муфціята на платформе “You Tube” – minsk mosque.

Сёлета – юбілейная, 625-гадовая дата асаднiцтва першых мусульман на беларускіх землях. У рамках адзначэння гэтай даты адбыліся мерапрыемствы ў Мінску, Іўі ды іншых мясцінах, у тым ліку, выстава ў музеі Ісламу на Беларусі і мастацкай галерэі Універсітэта культуры.

Быў выдадзены шэраг карысных кніг: каментар да Акыды ан-Насафія, падрыхтаваны імамам Мінскай мячэці, адказным за навукова-даследчы аддзел Максатам Авезавым, невялікія брашуры па жыццяпісу прарока Мухаммада ﷺ, жаночых пытаннях, посце і намазе для пачынаючых. Абнаўляўся спіс нашых выданняў (https://www.mechet.by/our-editions) і рэкамендаванай літаратуры (https://www.mechet.by/rekomenduemaya-literatura) на афіцыйным сайце нашага Аб’яднання. Ды і сам сайт неўзабаве будзе абнаўляцца і папаўняцца.

Бліжэйшым часам, калі будзе на тое воля Аллага, чакаецца выданне шэрагу цікавых прац: шматмоўны пераклад вядомага трактату пра татараў Вялікага Княства Літоўскага “Рысале-і татар-і лех”, кніг “Што такое Іслам?” і “Чаму я веру?”. Гэтыя праекты рэалізуюцца пры падтрымцы Упраўлення па справах рэлігіі Турэцкай Рэспублікі.

Усе гэтыя крокі накіраваны на захаванне і развіццё шматвяковай спадчыны Ісламу на Беларусі. Спадзяёмся, што нашыя намаганні не пройдуць марна.

*Рэдкалегія*

## ПЕРАКЛАД КУР'АНА

*Працягваем публікацыю перакладa Кур'ана, завяршым пераклад суры "Аль-Бакара" і пачнём пераклад суры "Алю 'Імран". Просім вывучаць змест дадзенага перакладу і старацца прымяняць на практыцы вывучанае.*

### Сура 2. Аль-Бакара (Карова)

**267.** О, вернікі! Ахвяруйце з тых даброт, якія вы прыдбалі, а таксама і з таго, што Мы вырасцілі дзеля вас з зямлі. Але не думайце ахвяраваць паганае, такое, што і самі вы не ўзялі б, хіба толькі з заплюшчанымі вачыма. І ведайце, што Аллаг – Той, Хто ані ў чым і не ў кім не мае патрэбы, Варты хвалы.

**268.** Шайтан стра́шыць вас беднасцю і схіляе вас да распусты (мярзоты), а Аллаг абяцае вам дараванне і ласку (шчодрасць). Аллаг – Усёабдымны, Усёведны *(атачае ўсе ласкай Сваёю і ўсё ведае)*.

**269.** Аллаг дае мудрасць, каму пажадае. А хто надзелены мудрасцю, той атрымаў вялікае дабро. Але разважаюць *[і здабываюць карысць ад настаўленняў]* толькі надзеленыя розумам.

**270.** Што б вы ні ахвяравалі са сваіх выдаткаў, якi б зарок не далі, – папраўдзе, Аллаг ведае пра тое. Але несправядлівым не будзе памагатых *(хто не плаціць закят і выдаткуе маёмасць на забароненае, таго ніхто не выбавіць ад Боскай кары)*.

**271.** Калі вы дасце міласціну адкрыта, будзе выдатна. Але калі вы ўпотай даяце яе ўбогім, то гэта яшчэ лепш для вас жа. Аллаг даруе вам некаторыя нядобрыя ўчынкі *(адпаведна колькасці і якасці раздадзенага, асабліва таемна)* і Аллагу вядома, што вы робіце *(таму неабавязкова рабіць дабро толькі адкрыта)*.

**272.** Няма на табе *[о Мухаммад]* абавязку весці іх прамым шляхам *(ніводзін чалавек не здольны надзяліць кагосьці вераю/іманам, гэтая справа не пад сілу людзям)*. Гэта Аллаг вядзе прамым шляхам, каго пажадае. А ахвяраванае вамі дабро – тое для вас жа саміх. Ахвяруйце, імкнучыся толькі да ўзнагароды Аллага. Якое б дабро вы не ахвяравалі, будзе вам аддадзена спаўна і не будзеце вы пакрыўджаны.

**273.** [Міласціна] – для ўбогіх, якія затрымаліся на шляху Божым, не могучы перасоўвацца па зямлі. Неабазнаны лічыць іх багатымі з-за іх сціпласці. Але ты пазнаеш іх па прыкметах іх: яны не выклянчваюць [міласціну] ў людзей настырна. І што б вы ні ахвяравалі са свайго дабра, Аллаг пра тое ведае.

**274.** Тым, хто ахвяруе сваё майно ўдзень і ўначы, таемна і яўна, – узнагарода іх у Госпада іх. Няма над імі страху і не будуць яны засмучоныя.

**275.** А тыя, хто ўжывае *[зробленае праз]* ліхвярства (працэнты), паўстануць [з магіл], нібы пабітыя шайтанскім дотыкам *(як звар'яцелыя)*. Гэта ім за тое, што казалі яны: "Гандаль – тое самае, што і ліхвярства". Але Аллаг дазволіў гандаль і забараніў ліхвярства *(нельга зарабляць на чужой бядзе, пазычаючы грошы пад працэнты)*. І хто пасля перасцярогі ад Пана Бога перастане *[зарабляць забароненым шляхам]*, то будзе даравана яму былое, а лёс яго [залежыць] ад [рашэння] Аллага. А хто ізноў [возьмецца за старое, ведаючы, што гэта грэх], тыя [стануць] жыхарамі Пекла, дзе быць ім давеку.

**276.** Аллаг нішчыць ліхвярства *(пазбаўляючы дабраславення зарobленае забароненым шляхам)* і памнажае міласціну *(даючы дабраславенне маёмасці, якая ачышчаецца дабрачыннасцю)*. Аллаг не любіць кожнага няверніка ды грэшніка.

**277.** Папраўдзе, тыя хто стаўшы вернікам, здзяйсняў добрыя справы, [як мае быць] выконваў намаз і выплачваў закят, атрымаюць узнагароду сваю ў Госпада іх. Няма над імі страху і не зазнаюць яны смутку.

**278.** О вернікі! Асцерагайцеся Аллага і адмоўцеся ад таго, што засталося ад *[заробленага праз]* ліхвярства, калі вы сапраўдныя *[шчырыя]* вернікі.

**279.** Калі ж вы не зробіце *[таго, што вам загадана]*, то *[ведайце, што]* абвяшчаюць вам вайну Аллаг і Пасланец Яго *(і што можа быць горш за гэта?!)*. А калі раскаецеся, то застанецца вам першапачатковы капітал *(тое, што было пазычана вамі спачатку, без працэнтаў)*. Не чыніце несправядлівасці, і з вамі не абыдуцца несправядліва.

**280.** Калі [даўжнік] будзе ў цяжкім становішчы, то дайце яму час, пакуль стан яго не палегчыцца. А калі прабачыце яму гэта *(пазыку)*, зрабіўшы міласцінай, гэта будзе лепш для вас, каб вы толькі ведалі!..

**281.** Дык бойцеся ж таго Дня, калі будзеце вернутыя вы да Аллага. Кожнаму спаўна будзе адплачана за тое, што ён прыдбаў *(зрабіў)*, і не абыдуцца з імі несправядліва.

**282.** О вернікі! Калі заключаеце дамову пра пазыку на пэўны тэрмін (час), то запісвайце яе. І хай пісар запісвае яе як мае быць, і не адмаўляецца запісаць яе так, як навучыў яго Аллаг. Хай піша, а той хто бярэ ў доўг (запазычвае), няхай дыктуе яму, баючыся Аллага, Госпада свайго, і не памяншае нічога *(=не заніжае суму пазычанага, падманваючы)*. А калі той, хто бярэ пазыку, слабы на розум, нядужы *(занадта малы альбо стары)* і не здольны дыктаваць, то хай дыктуе па справядлівасці яго апякун *(давераная асоба)*. Вазьміце ў якасці сведак двух мужчын з вас *(з ліку мусульман)*. А як не будзе мужчын, то хай тады будзе мужчына і дзве жанчыны, якіх вы згодны ўзяць за сведак. Нават калі адна з іх памыліцца, дык другая ёй нагадае. Хай сведкі не адмаўляюцца, калі запрашаюць іх *[засведчыць]*. Не грэбуйце запісаць дамову, якой бы *[пазыка ні была]* – малой альбо вялікай, з вызначэннем яе тэрміну. Так будзе справядлівей перад Аллагам, надзейней для сведчання і лепш для пазбягання [далейшых] сумневаў. Калі ж вы заключаеце наяўную здзелку і расплачваецеся на месцы, то не будзе граху на вас, калі не запішаце яе. Але клічце сведкаў, калі заключаеце гандлёвыя дамовы. Нельга шкодзіць ні пісару, ні сведку. А калі ўчыніце тое, то будзе вам грэх. І бойцеся Аллага – Ён навучае вас. Аллаг ведае пра ўсё існае.

**283.** А калі вы апынецеся ў дарозе і не знойдзеце пісара, то прызначце заклад, які можна перадаць *[у рукі іншаму]*. І калі адзін з вас штосьці давярае іншаму, то хай той, каму даверана, вяртае даверанае яму *(выканае сваё абавязацельства)*, і хай баіцца Аллага, Госпада свайго. Не хавайце сведчання; а ў тых, хто хавае яго, сэрца пашкоджана грахом. Аллаг ведае пра ўсё, што вы робіце.

**284.** Аллагу належыць тое, што на нябёсах і тое, што на зямлі. Выявіце вы тое, што ў душах вашых, альбо ўтоіце – Аллаг патрабуе разліку за гэта. Ён прабачае, каго хоча, і карае, каго хоча. І Аллаг можа абсалютна ўсё *(робіць, што заўгодна Яму)*.

**285.** Пасланец *(Мухаммад)* паверыў у тое, што паслана яму ад Госпада яго, *[а следам за ім]* – і вернікі. Усе яны паверылі ў Аллага, у анёлаў Яго, у Пісанні Яго і ў пасланцаў Яго, *[кажучы]*: “Мы не робім адрозненняў паміж пасланцамі”. Кажуць яны *[таксама]*: “Слухаем і слухаемся! Твайго прабачэння просім, Госпадзе наш, бо да Цябе – вяртанне”.

**286.** Аллаг не ўскладае на чалавека нічога звыш яго магчымасцей *(таго, што не пад сілу чалавеку)*. За яго *(на яго карысць)* – тое, што прыдбаў сабе ён *(сумленнай працай дзеля шчасця ў абодвух сусветах)*, а супраць яго – тое, што здабыў ён *(затраціўшы нямала высілкаў дзеля марнага, а нярэдка – і яўна грахоўнага)*. *[Кажуць пасланец і вернікі, звяртаючыся да Бога]*: “Пане наш! Не спаганяй з нас, калі забыліся мы *[што-небудзь]* альбо памыліліся. Пане наш! Не ўскладай на нас цяжару, які ўсклаў Ты на нашых папярэднікаў. Пане наш! І не ўскладай на нас таго, што не пад сілу нам. Не карай нас за грахі, даруй нам *(выбавіўшы ад сораму)* і злітуйся з нас *(замяніўшы грахі на вартасці)*! Ты – Апякун наш, то ж дапамажы нам супраць нявернікаў!”

*На гэтым з ласкі Божай завяршаем пераклад суры “Аль-Бакара”.*

## Сура 3. Алю Імран (Род Імрана)

***Паслана ў Мецчы. У ёй 200 аятаў.***

*Сура “Алю Імран” – адна з доўгіх медзінскіх сур, якая ахоплівае два важных аспекты рэлігіі: адзінабожжа (таўхі́д) і рашэнні (ахка́мы) Шарыяту. У гэтай суры ёсць аяты пра адзінства Аллага Усявышняга і доказы гэтага. Шарыяцкія ж пастановы закранаюць нормы ўзброенай барацьбы на шляху Божым, пытанні хаджу, закяту і ліхвярства. Палова суры прысвечана аповяду пра прарока Ісу, сына Мар’ям (мір над ім). Апісваюцца бітвы пры Бадры і Ухудзе, паводзіны і прыкметы крывадушнікаў. Асобная ўвага надаецца неабходнасці назіраць за сусветам, выносіць урок з гэтых назіранняў і ўзгадваць Аллага, просячы Яго аб прабачэнні, на што Ён абавязкова дасць адказ і надзеліць цярпеннем, трываласцю і богабаязнасцю – важнейшым вартасцям дзеля здабыцця шчасця на гэтым і на тым свеце.*

*У імя Аллага, Ласкавага, Літасцівага!*

**1.** Аліф. Лям. Мім.

**2.** Аллаг – няма бога, акрамя Яго, Жывога, Самаіснага *(Які кіруе ўсім у свеце)*.

**3.** Ён паслаў табе *(о Мухаммад)* Пісанне з ісцінай, якое пацвярджае тое, што было раней *(папярэдніх нябесных Кніг)*; і паслаў Таўрат (Тору) і Інджыль (Евангелле),

**4.** якія перш былі кіраўніцтвам для людзей, і таксама паслаў Ён Адрозненне *(Кур’ан)*. Папраўдзе, тых, хто не верыць у азнакі Божыя, чакае лютая кара, бо Аллаг – Усемагутны, Валадар адплаты *(здольны пакараць)*.

**5.** Папраўдзе, ад Аллага нішто не ўкрыецца ні на зямлі, ані на небе.

**6.** Ён – Той, Хто ўжо ў *[матчыных]* улоннях надае такое аблічча вам, якое пажадае. Няма нікога, вартага пакланення, акрамя Яго, Магутнага, Мудрага.

**7.** Ён – Той, Хто паслаў табе Пісанне, у якім ёсць ясныя *(зразумелыя без дадатковага тлумачэння)* аяты *(мухкамат)*, і яны – аснова Пісання. А ёсць і іншыя *(іншасказальныя/шматзначныя)*, сэнс якіх не відавочны *(муташабігат)*. Тыя, чые сэрцы ўхіліліся ўбок *(і трапілі ў аблуду)*, ідуць следам выключна за іншасказальнымі аятамі, прагнучы калатні, прагнучы дамагчыся такога тлумачэння *[якое б задаволіла іх нізкія патрэбы]*. Але *[дакладнага]* тлумачэння іх не ведае ніхто, акрамя Аллага. А ўладальнікі грунтоўных ведаў кажуць: “Мы верым у гэта *(у весь Кур’ан і ва ўсе яго аяты)*. Усё гэта – ад Госпада нашага”. Але прымаюць настаўленне толькі надзеленыя *[чыстым і незасмечаным]* розумам.

**8.** “Пане наш! Не адхіляй сэрцы нашыя *(ад ісціны)* пасля таго, як Ты вывеў іх на прамы шлях. І надзялі нас ласкаю ад Сябе, бо, папраўдзе, Ты – надзяляеш шчодра.

**9.** Пане наш! Папраўдзе, Ты збярэш людзей разам у Дзень, у якім няма сумневу *(г.зн., у Судны дзень)*”. Папраўдзе, Аллаг не парушае абяцання.

**10.** Папраўдзе, нявернікам ні майно, ні дзеці аніяк не выбавяць ад *[пакарання]* Аллага, а самі яны *[стануць хіба што]* палівам для *[пякельнага]* агню.

**11.** Гэтак жа *[паводзіліся]* суродзічы Фараона і іх папярэднікі. Яны адрынулі азнакі Нашы, і Аллаг пакараў іх за грахі іх. А Аллаг – бязлітасны ў пакаранні.

**12.** Скажы *(о Мухаммад)* нявернікам: “Вас адолеюць і збяруць разам у апраметнай. Але ж гэта і жудасны прытулак!”

**13.** Азнакай вам было сутыкненне паміж дзвюма атрадамі *[ў бітве пры Бадры[1]]*. Адно войска змагалася на шляху Аллага, а другое – *[складалася з]* нявернікаў, якія на свае вочы ўбачылі, што *[вернікаў]* ўдвая больш *[за іх]*. бо Аллаг дапамагае таму, каму захоча. Папраўдзе, у гэтым – прыклад для праніклівых *(пільных сэрцам)*.

**14.** Людзям здаецца выдатнай любоў да задавальненняў – ад жонак, сыноў, процьмы кантараў (кынтараў[2]) назапашанага золата і срэбра, файных коней, гавяды да нівы. Але гэта – толькі хуткаплынная асалода сегасветнага жыцця, тады як у Аллага – найлепшае, да чаго варта імкнуцца.

**15.** Скажы: “Ці распавесці вам пра нешта лепшае за тое? Для баязнікаў Божых у Госпада іх ёсць *[райскія]* сады, дзе цякуць рэкі і дзе яны будуць давеку, а *[з імі – будуць там]* чыстыя жонкі і задавальненне ад Аллага. І Аллаг *[заўжды і паўсюль]* бачыць *[Сваіх]* рабоў,

**16.** якія кажуць: “Пане наш! Папраўдзе, мы паверылі, дык адпусці ж нам грахі нашы і выбаві нас ад пакарання *[пякельным]* Агнём!”.

**17.** Цярплівыя яны, праўдзівыя, пакорлівыя *[Богу]*, ахвяруюць *[сродкі на добрае]* і просяць прабачэння *[за грахі перад Богам]* да віднá *(да надыходу світання)*.

---

[1] Бітва пры Бадры – бітва ля мястэчка Бадр, якая адбылася ў 624 годзе. Падчас яе атрад з трохсот трынаццаці мусульман перамог амаль тысячнае войска мекканскіх паганцаў.
[2] Кынтар (кінтар, кантар) – мера вагі, каля 44 кг.

**18.** Засведчыў Аллаг *(прывёўшы пераканаўчыя доказы)*, што няма іншага боства, апроч Яго; *[засведчылі гэта таксама]* анёлы і надзеленыя ведамі. Ён падтрымлівае справядлівасць. Няма бога, акрамя Яго, Велічнага, Мудрага.

**19.** Папраўдзе, *[праўдзівая]* рэлігія перад Аллагам – гэта іслам. Тыя ж, каму было дадзена Пісанне, загразлі ў рознагалоссях з-за ўзаемнай несправядлівасці *(якая была спароджана зайздрасцю)* толькі пасля таго, як прыйшлі да іх веды. А калі хто не верыць у азнакі Божыя, дык *[хай ведае, што]* Аллаг – скоры на разлік.

**20.** Калі яны стануць спрачацца з табою, то скажы *[ім, Мухаммад]*: “Я скарыў сябе Аллагу разам са сваімі паслядоўнікамі”. І скажы людзям Пісання, а таксама непісьменным *(паганцам)*: “Ці не скорыцеся і вы *(прыняўшы іслам)*?” Калі яны скарацца *(прымуць іслам)*, то рушаць шляхам прамым. А калі адвернуцца, то *[на табе не будзе віны за гэта]*, на табе – толькі давядзенне *[гэтага да іх ведама]*. А Аллаг *[заўжды і паўсюль]* бачыць *[Сваіх]* рабоў.

**21.** Папраўдзе, тыя, хто не верыць у азнакі Божыя, забіваюць пракокаў, не маючы на тое ніякога права, і забіваюць тых, хто заклікае да справядлівасці, – “узрадуй” іх весткай *(паведамі ім)* пра пакутную кару *[у Пекле]*.

**22.** Іх *[добрыя]* учынкі будуць марнымі і на гэтым свеце, і ў вечнасці, і няма ім памочнікаў *(якія б маглі за іх заступіцца)*.

**23.** Хіба не бачаў ты, як тых, каму была дадзена частка Пісання, заклікаюць да Кнігі Аллага, каб *[паводле яе]* рассудзіць між імі, але частка адварочваецца *[ад яе]*, адмаўляючыся *[кіравацца ёю]*?

**24.** Гэта адбываецца таму, што яны кажуць: “Агонь *[Пекла]* кране нас хіба што на лічаныя дні”. Іх спакусіла ў іх веры тое, што яны самі і выдумалі.

**25.** А што ж будзе з імі тады, калі Мы збяром іх у Дзень, у якім няма сумневу, і калі будзе адплочана кожнай душы спаўна за тое, што прыдбала яна і ні з кім не абыдуцца несправядліва?

**26.** Скажы: “О Аллаг, Валадар усяго! Ты надзяляеш уладай, каго захочаш, і адбіраеш уладу, у каго захочаш. Ты ўзвышаеш, каго захочаш, і прыніжаеш, каго захочаш. Табе належыць усё дабро. Папраўдзе, Ты можаш усё.

**27.** Ты ўводзіш ноч у дзень *(падаўжаючы дзень)*, і дзень – у ноч *(падаўжаючы ноч)*. І Ты выводзіш жывое з мёртвага, а мёртвае – з жывога *(надзяляеш жыццём і смерцю, верай і нявер’ем)*. Ты надзяляеш пажыткам, каго захочаш, незлічоным *(без усялякага ліку)*”.

**28.** Хай вернікі не бяруць сабе блізкімі сябрамі нявернікаў замест вернікаў. А хто робіць так, не мае дачынення да *[рэлігіі]* Аллага, акрамя выпадкаў, калі вы такім чынам бароніцеся ад іх. Аллаг перасцерагае вас ад Самога Сябе *(пакарання Свайго)*, і да Аллага – вяртанне вашае.

**29.** Скажы *[ім, Мухаммад]*: “Ці ўтоіце вы тое, што на душы ў вас, ці выявіце – Аллаг *[усё адно]* ведае пра тое. Ён ведае усё, што на нябёсах і што на зямлі. І Аллаг можа ўсё”.

**30.** У той Дзень кожны ўбачыць усё добрае і злое, што ён зрабіў, і тады ён захоча, каб між ім і гэтым *[Днём альбо яго грахамі]* пралягла вялізная адлегласць. Аллаг перасцерагае вас ад Самога Сябе *(Свайго гневу)*, і Ён – Лагодны да *[Яго]* рабоў.

**31.** Скажы *[ім, Мухаммад]*: "Калі вы любіце Аллага, то ідзіце за мною. Тады палюбіць вас Аллаг і прабачыць вам грахі вашы. Аллаг – Прабачлівы, Літасцівы".

**32.** Скажы *[ім таксама]*: "Слухайцеся Аллага і Пасланца". Калі ж яны адвернуцца *[з-за нявер'я, дык хай ведаюць]*, што Аллаг не любіць нявернікаў.

**33.** Папраўдзе, Аллаг абраў Адама, Нуха, род Ібрагіма і род Імрана *[узвысіўшы іх]* над *[жыхарамі]* сусветаў.

**34.** Адны з іх былі нашчадкамі іншых. А Аллаг чуе і ведае ўсё.

**35.** Вось сказала жонка Імрана: "Пане Божа! Я дала зарок прысвяціць Табе тое, што ва ўлонні маім. Дык прымі ж *[дзіця маё]* ад мяне! Папраўдзе, Ты ўсё чуеш і ўсё ведаеш".

**36.** І калі яна нарадзіла яе *[Мар'ям]*, то сказала: "Пане Божа! Я нарадзіла дзяўчынку!" – ды Аллаг лепш *[за яе]* ведаў, каго яна нарадзіла. – "А мужчынскі пол – не тое самае, што і жаночы! Я назаву яе Мар'ям, і прашу Цябе абараніць яе з яе нашчадкамі ад выклятага[3] шайтана".

**37.** Аллаг прыняў *[дзіця]* прыхільна, вырасціў яе добраю і даручыў яе Закарыі. Штоpазу, калі Закарыя ўваходзіў у яе малельню (пакой у храме, *міхраб*), знаходзіў пры ёй пажытак *(свежую садавіну і іншую ежу)*. Спытаў ён яе: "О, Мар'ям, адкуль у цябе гэта?" Адказала яна: "Гэта – ад Аллага. Папраўдзе, Аллаг надзяляе пажыткам, каго хоча, без усялякага ліку".

**38.** Тады Закарыя звярнуўся з мальбою да Госпада свайго: "Пане Божа! Надзялі мяне ад Сябе цнатлівымі нашчадкамі; папраўдзе, Ты ўважаеш мальбе!"

**39.** І вось, калі ён здзяйсняў малітву ў малельні (=*міхраб,* месцы свайго малення), да яго звярнуліся анёлы: "Аллаг радуе цябе дабравесцем пра Ях'ю, які пацвердзіць слова ад Аллага, будзе панам *(правадыром людзей)*, будзе цнатлівым *(абароненым ад грахоў)* і стане прарокам з ліку праведнікаў!"

**40.** Той мовіў: "Пане! Як жа можа быць у мяне хлопчык, калі ўжо напаткала мяне старасць, а жонка мая бясплодная?" Сказаў *[анёл]*: "Будзе так, бо Аллаг робіць тое, што хоча!"

**41.** Закарыя сказаў: "Пане Божа, дай мне азнаку". Адказаў *[анёл]*: "Азнакаю табе будзе тое, што ты не зможаш тры дні размаўляць з людзьмі, хіба толькі знакамі. І як мага больш згадвай Госпада свайго, і ўслаўляй Яго надвячоркам і ўранні".

**42.** І сказалі анёлы: "О Мар'ям! Папраўдзе, Аллаг абраў цябе і ачысціў, аддаўшы табе перавагу перад жанчынамі ўсіх народаў *[твайго часу]*!

[3] Літаральна "бітага каменнем". Гэты выраз азначае праклён і выгнанне, якое напаткала шайтана за яго непаслушэнства Богу. Гл. таксама каментар да суры "аль-Хіджр", 15:34.

**43.** О Мар’ям! Будзь пакорлівай перад Госпадам сваім, схіляйся ў паклонах зямных і паясных, разам з тымі, хто кладзе паклоны”.

**44.** Тое – адна з вестак пра таемнае, якія Мы адкрываем табе. Ты не быў ля тых, хто кідаў свае трысцінкі для пісьма *[у якасці жэрабя, каб вырашыць]*, каму будзе даручана апека над Мар’ям. І не было цябе ля іх, калі яны спрачаліся *[пра гэта]*.

**45.** Вось сказалі анёлы: “О Мар’ям! Папраўдзе, Аллаг радуе цябе дабравесцем пра слова ад Яго. Імя яму – Месія, Іса, сын Мар’ям. Ён будзе ўшанаваны ў жыцці сегасветным і ў жыцці вечным, і стане адным з набліжаных.

**46.** Ён будзе размаўляць з людзьмі яшчэ ў калысцы і ў сталым узросце, і стане адным з праведнікаў”.

**47.** Яна сказала: “Пане Божа, як можа быць у мяне дзіця, калі ніводзін мужчына не крануў мяне?” Адказаў *[анёл]*: “Так будзе, бо Аллаг чыніць тое, што хоча”. Калі вырашае Ён штосьці *[стварыць]*, то толькі скажа: “Будзь!” – і яно з’яўляецца.

**48.** І *[Аллаг]* навучыць яго Пісанню і мудрасці, Таўрату і Інджылю.

**49.** І зробіць *[яго Аллаг]* пасланцом да сыноў Ісраілевых. *[Скажа ім Іса]*: “Я прыйшоў да вас з азнакамі ад Госпада вашага. Я зраблю вам з гліны штось накшталт птушкі, дзьмухну на яе і яна, з дазволу Аллага, сапраўды стане птушкай. Я ацалю невідушчага і хворага праказай (струпляй) ды ажыўлю *[кагосьці з]* памерлых – з дазволу Аллага. Я распавяду вам пра тое, што вы ясце, і што захоўваеце ў жытлах сваіх. Папраўдзе, у тым будзе азнака вам, калі вы ёсць вернікамі.

**50.** Я пацверджу тое, што было *[паслана перш,]* да мяне, у Таўраце, і дазволю вам частку таго, што было забаронена вам *[папярэднім шарыятам]*. Я прыйшоў да вас з азнакамі ад Госпада вашага. Дык асцерагайцеся Аллага і паслухайцеся мяне”.

**51.** Папраўдзе, Аллаг – мой Госпад і ваш Госпад. Пакланяйцеся ж Яму! Гэта і ёсць прамы шлях”.

**52.** І калі ‘Іса адчуў нявер’е іх *(сыноў Ісраіля)*, то спытаў: “Хто стане мне памочнікам на шляху да Аллага?” Адказалі апосталы: “Мы – памочнікі Божыя! Паверылі мы ў Аллага, то засведчы, што мы – мусульмане *(адданыя Яму)*.

**53.** Пане Божа! Мы паверылі ў тое, што Ты паслаў, і пайшлі следам за пасланцом; то ж запішы нас разам са сведкамі *[якія сведчаць пра адзінабожжа]*!”

**54.** *[Нявернікі]* хітравалі, але Аллаг разбурыў іх хітрыкі, бо Аллаг – лепшы за хітруноў.

**55.** Вось Аллаг мовіў: “О Іса! Папраўдзе, Я забяру цябе, узнясу цябе *[жывым]* на ўзвышанае Мною месца *(на другое неба)* і ачышчу *(выбаўлю)* цябе ад нявернікаў. І Я ўзвышу тваіх паслядоўнікаў над нявернікамі – аж да Дня Уваскрасення. А потым вы вернецеся да Мяне і Я рассуджу між вамі, аб чым вы разыходзіліся *[у меркаваннях]*.

**56.** А нявернікаў Я пакараю цяжкаю караю і ў сегасветным жыцці, і ў вечнасці. І не будзе ў іх памочнікаў *(заступнікаў)*.

**57.** Вернікам жа, якія рабілі добрае, Ён прыспорыць узнагароду спаўна. Аллаг не любіць несправядлівых!”

**58.** Так Мы чытаем *(распавядаем)* табе *(Мухаммад)* з аятаў і Напаміну, поўнага мудрасці.

**59.** Папраўдзе, Іса перад Аллагам падобны да Адама *(у абодвух не было бацькі)*: Ён стварыў яго *(Адама)* з праху *(зямлі)*, а пасля мовіў: “Будзь” – як той з’явіўся *(ажыў)*.

**60.** *[Усё гэта]* – ісціна ад Госпада твайго. Дык не будзь з ліку тых, хто сумяецца *(недаверкаў)*.

**61.** Калі ж хто стане спрачацца з табою аб ім *[аб Ісе, мір над ім]* пасля таго, як да цябе дайшлі веды, то скажы: “Прыходзьце! Давайце паклічам нашых і вашых сыноў, нашых і вашых жонак, *[прыдзем]* самі і вы *[прыдзеце]* самі, а тады папросім *[Бога]*, каб праклён Аллага абрынуўся на ілгуноў[4]”.

**62.** Папраўдзе, гэта – праўдзівы аповяд. І няма бога, вартага пакланення, акрамя Аллага, і, папраўдзе, Аллаг – Вялікі, Мудры.

**63.** Калі ж яны адвернуцца *[ад праўды]*, то, папраўдзе, Аллаг ведае паскуднікаў.

**64.** Скажы *(Мухаммад)*: “О людзі Пісання! Давайце прыйдзем да адзінага слова паміж намі і вамі – што не будзем пакланяцца нікому, апроч Аллага, не будзем надаваць Яму ніякай раўні і не будзем лічыць госпадам *(заканадаўцам)* кагосьці з нас альбо з вас, акрамя Аллага”. Калі ж яны адвернуцца *[адмовіўшыся ад адзінабожжа]*, то скажыце *(вернікі)*: “Засведчыце, што мы – мусульмане”.

**65.** О паслядоўнікі Пісання! Чаму вы спрачаецеся пра *[веравызнанне]* Ібрагіма, пры тым, што Таўрат і Інджыль былі пасланы ўжо пасля яго? Хіба вы не разумееце *[сваю памылку]*?

**66.** Перш вы спрачаліся толькі пра тое, што было вядома вам. А зараз навошта вы спрачаецеся пра тое, што вам і невядома? Аллаг ведае ўсё, вы – не ведаеце.

**67.** Ібрагім не быў ані іўдзеем, ані хрысціянінам, а быў ён адданым ханіфам *(адзінабожнікам-мусульманінам)* і не быў шматбожнікам (паганцам).

**68.** Папраўдзе, найбліжэйшыя з людзей да *[веравызнання]* Ібрагіма тыя, хто пайшоў за ім *(пры яго жыцці)*, а таксама гэты Прарок *(Мухаммад)* і вернікі *(паслядоўнікі Мухаммада)*. Аллаг жа – Апякун вернікаў.

**69.** Хто-ніхто з людзей Пісання прагне, каб вас *(мусульмане)* увялі ў аблуду. Але трапяць у аблуду яны самі, нават таго і не адчуўшы.

**70.** О людзі Пісання! Чаму вы не верыце ў азнакі Божыя, хоць вы і відавочцы іх?

**71.** О людзі Пісання! Чаму вы апранаеце ісціну ў адзенне няпраўды *(блытаючы адно з іншым)*, прыхоўваючы ісціну, ведаючы яе?

---

[4] Маецца на ўвазе *мубáгаля* – узаемны заклік праклёну, спосаб вырашэння рэлігійнай спрэчкі, які выкарыстоўваецца, калі вычарпаны астатнія варыянты і прывядзенне іншых аргументаў ужо немагчымае. Неабавязкова, каб у гэтым удзельнічала шмат людзей, але гэта падвышае эфектыўнасць такога вырашэння спрэчкі, паколькі тады рызыкаваць будуць здольныя толькі тыя, хто насамрэч перакананы ў сваёй праваце *(Ма’арыф аль-Кур’ан, 2/91)*.

**72.** А іншая частка людзей Пісання сказала: “Верце ў тое, што паслана вернікам *(мусульманам)* на пачатку дня, а напрыканцы дня – не верце; можа быць, яны дадуцца назад *(адмовяцца ад сваіх перакананняў следам за вамі)*.

**73.** Не верце анікому, акрамя таго, хто пільнуецца вашай рэлігіі”. Скажы *(Мухаммад)*: “Папраўдзе, прамы шлях – шлях *(рэлігія)* ад Аллага”. *[Людзі Пісання баяцца]*, каб хтосьці не атрымаў таго, што ёсць у іх, альбо каб не змог паспрачацца з імі перад Госпадам вашым. Скажы *(Мухаммад)*: “Папраўдзе, ласка належыць Аллагу; Ён надзяляе ёю, каго пажадае”. І Аллаг – атачае ўсё і ўсё ведае *(ахоплівае ўсё сваёй дабрынёй і веданнем)*. *(пераклад паводле Бесіма Коркута і Ібн Кясіра).*

**74.** Вылучае Ён для ласкі Сваёй, каго пажадае. Аллаг – Валадар вялікае ласкі.

**75.** Сярод людзей Пісання ёсць такія, якія, калі ты даверыш ім хоць цэлы кынтар *(вялікае багацце)*, вернуць табе яго *[цэлым і спраўным]*; а ёсць такія, якія табе і даверанага дзінара не вернуць, хіба толькі як ты станеш у іх *[над душой]*. Гэта з-за іх словаў: “Не будзе нам граху *[падмануць]* гэтых невукаў *(арабаў)*!” Яны нагаворваюць на Аллага свядома.

**76.** Вядома, калі хто трымаецца запавету з ім і баіцца Аллага *[той варты ўзнагароды]*, бо Аллаг любіць богабаязных.

**77.** Папраўдзе, тым, хто прадае запавет Боскі і веру сваю за мізэрны кошт, няма долі ў вечнасці. Не стане гаварыць з імі Аллаг, не гляне на іх у Судны дзень *[поглядам літасці]* і не ачысціць іх *[ад бруду грахоў]*. Чакае іх пакутная кара.

**78.** І ёсць сярод іх такія, хто скажае Пісанне сваімі языкамі, каб вы прынялі за Пісанне тое, чаго ў Пісанні няма. Ды яшчэ і гавораць: “Гэта – ад Аллага”, – а насамрэч гэта не ад Аллага. Яны паклёпнічаюць на Аллага наўмысна.

**79.** Немагчыма, каб чалавек, якому Аллаг даў Пісанне, мудрасць і прароцтва, казаў людзям: “Будзьце рабамі мне, а не Аллагу!” Наадварот, *[усе прарокі казалі]*: “Будзьце настаўнікамі *(людзьмі Божымі, якія практыкуючы свае веды, прыносяць карысць навакольным)*, пакольki вы навучаеце Пісанню і вывучаеце яго”.

**80.** І не стане *[такі чалавек]* загадваць вам, каб абагаўлялі анёлаў або пракокаў. Хіба ж ён стане загадваць вам нявер’е пасля таго, як вы сталі мусульманамі?!

**81.** Аллаг заключыў запавет з прарокамі *(узяў з іх абяцанне)*: “Вось тое, што даю Я вам з Пісання і мудрасці. Потым прыдзе да вас пасланец, які пацвердзіць тое, што будзе ў вас. Вам належыць паверыць у яго і дапамагаць яму”. І Ён спытаў: “Ці згодныя вы з гэтым і ці возьмеце тое на сябе?” Тыя адказалі: “Мы згодныя!” Ён сказаў: “Засведчыце *[гэта],* і Я буду сведчыць разам з вамі!

**82.** А хто адвернецца пасля таго *(адмовіўшыся ад абяцанага)*, то тыя – распуснікі”.

**83.** Няўжо яны прагнуць іншай рэлігіі замест рэлігіі Аллага? Яму скарыліся ўсе, хто на нябёсах і на зямлі – па добрай волі і міжволі, і да Яго яны вернуцца.

**84.** Скажы *(Мухаммад)*: “Мы паверылі ў Аллага і ў тое, што паслана нам, і што было паслана Ібрагіму, Ісмаілу, Ісхаку, Якубу і *[яго]* нашчадкам; у тое, што дадзена Мусе, Ісе і *[астатнім]* прарокам ад Госпада іх. Мы не робім адрозненняў паміж імі, і мы – адданыя Яму *(мусульмане)*”.

**85.** Хто шукае іншае рэлігіі замест ісламу, ад таго гэта не будзе прынята *(у Судны дзень)*, а ў вечнасці будзе ён сярод банкрутаў.

**86.** Як жа Аллаг павядзе *[шляхам ісціны]* тых людзей, якія сталі нявернікамі пасля таго, як мелі веру, сведчылі пра праўдзівасць Пасланца Божага, і да якіх прыйшлі ясныя азнакі?! Аллаг не вядзе прамым шляхам людзей несправядлівых.

**87.** Адплата ім – праклён *(аддаленне ад літасці)* Аллага, анёлаў ды ўсіх людзей.

**88.** Будуць яны пад ім *(пад праклёнам, у Пекле)* давеку. Не будзе палегчана ім кара і не будзе адтэрмінавана,

**89.** акрамя тых, хто раскаецца пасля таго *(вераадступніцтва)* і выправіцца. Папраўдзе, Аллаг – Прабачлівы, Літасцівы *(да вернікаў)*.

**90.** Папраўдзе, ад тых, хто стаў нявернікам пасля таго, як прыдбаў веру, а потым яшчэ і памножыў сваё нявер'е, не будзе прынята пакаянне іх, бо яны – аблудныя.

**91.** Папраўдзе, ад тых, якія былі нявернікамі і памерлі на нявер'і, – не будзе прынята нават золата памерам з Зямлю, калі яны паспрабуюць адкупіцца гэтым. Іх чакае пакутная кара і не будзе ў іх памочнікаў.

**92.** Вам не дасягнуць пабожнасці, пакуль не станеце ахвяраваць тое *(з маёмасці)*, што міла вам. І што б ні ахвяравалі вы, Аллаг пра тое ведае.

**93.** Любая ежа была дазволена сынам Ісраілевым, акрамя той, якую Ісраіль *(Якуб)* забараніў сабе сам да паслання Таўрату. Скажы *(іўдзеям)*: "Прынясіце Таўрат і прачытайце тое *[што вы сцвярджаеце]*, калі вы кажаце праўду".

**94.** Калі ж хтось пасля таго стане паклёпнічаць на Аллага, то такія і ёсць несправядлівыя!

**95.** Скажы: "Праўду сказаў Аллаг! Рушце за рэлігіяй Ібрагіма, які быў ханіфам *(адзінабожнікам)*, а не паганцам *(шматбожнікам)*".

**96.** Папраўдзе, першы дом *(храм)*, узведзены для людзей – гэта Дом у Бекцы *(Кааба ў Мецыы)*, які стаў дабраславеннем і прамым шляхам для сусветаў *(стварэнняў)*.

**97.** Там *(у Каабе)* – відавочныя азнакі. *[Сярод іх]* – месца стаяння Ібрагіма. Хто ўвойдзе туды, будзе ў бяспецы. Людзі абавязаны перад Аллагам здзяйсняць хадж да Дома, калі будуць здольныя на гэта. Калі ж хтось не верыць, то Аллагу няма патрэбы ў *[жыхарах]* сусветаў.

*Давуд Радкевіч*

# СЛОЎНІК БЕЛАРУСКІХ ТАТАРАЎ

*Заснавальнік часопіса "Байрам", вядомы беларускі энцыклапедыст Якуб Адамавіч Якубоўскі, яшчэ ў сярэдзіне 1990-ых гг. распачаў праект слоўніка беларускіх татараў. На жаль, ён так і не быў рэалізаваны пры жыцці Якуба Адамавіча. Аддаючы павагу пану Якубоўскаму, мы пачынаем публікацыю слоўніка, з улікам новых магчымасцяў нашае рэдакцыі і звестак. У гэтым нумары – словы на літару А.*

**Абазішча** – маёнтак Крычынскіх каля в. Ардашы Смаргонскага раёна. Апошні ўладальнік – Леон Хасеневіч Крычынскі, суддзя. Цалкам знішчаны.

**Абас** – імя дзядзькі прарока Мухаммада ﷺ. У Актах Літоўскай метрыкі сустракаецца імя Апаз.

**Аблюцыя –** гл. Абдэст.

**Абдуллаг** – мужчынскае імя, "раб Аллага". Формы – Абда, Абдула.

**Абдурахман** – імя, "раб [Бога] Літасцівага".

**Абдэст** – (*перс. ab* – вада, *dest* – рука) назва прыйшла з персідскай мовы праз пасярэдніцтва асманскай (старатурэцкай). Рытуальнае ўмыванне, якое з'уляецца неабходным для рытуальнага пакланення (намаз, таваф – абыход вакол Каабы), уваходу ў мячэць і дакранання да мусхафа (экзэмляра Кур'ана). У арабскай мове вядома пад назвай *вудӯ'* (малое ўмыванне). У рукапісах і гутарковай мове беларускіх татар сустракаецца форма "абдэ́сь".

**Абрагам** – больш правільна – Ібрагім. Імя аднаго з пракокаў, які з'уляецца прашчурам семіцкіх народаў, у тым ліку арабаў (праз свайго сына Ісмаіла) і габрэяў (праз сына Ісхака). Формы – Аброль, Абратэм, Абрам, Аўраам, Аблём, Ібра.

**Абрагімовіч** – прозвішча татараў з в. Іванава Нясвіжскага раёна. Першапачаткова паходзілі з Вакі.

**Абрагімовіч Іосіф Адамавіч** (1905 - 1944) – старшыня камітэту культуры і асветы. Нарадзіўся і жыў у в. Іванава. Забіты падчас вайны. Дзеці Танзіля, Ян, Ева, Якуб.

**Абрагімовіч Іосіф Давыдавіч** (1825 - ?) – калегіяльны рэгістратар. Ваўкавыск, павятовая скарбовая палата. У 1854 перайшоў у праваслаўе.

**Абрамаўшчына** – маёнтак на рацэ Жыжма. Апошні ўладальнік – Мустафа Аляксандравіч Якубоўскі, калегіяльны сакратар, які набыў у Ёдкаў маёнтак у 1841. Каля 800 дзесяцінаў зямлі. У складзе маёнтка – Дайнова, Пяцюны, Лаўцуны. Мустафа Якубоўскі пахаваны ў Іўі.

**Абрамовіч** – прозвішча татараў, што жылі ў Клецку, Мураўшчызне, Даўбуцішках. Найбольш знаныя прадстаўнікі – улан, удзельнік баёў на Монтэ-Касіна Мустафа Ібрагімавіч Абрамовіч з Клецка.

**Абрамовіч Мустафа** (1724 - ?) – імам мячэці на Лукішках у Вільні.

**Абрамовіч Мустафа Ібрагімавіч** (1916 - 2018) – ветэран. Нарадзіўся ў Клецку, служыў у палку ўланаў Віленскіх. У 1939 апынуўся ў палоне, працаваў у шахтах. Трапіў у армію Андэрса, прайшоў шлях праз Іран, Палястыну, ваяваў у Італіі. Пасля вайны жыў Манчэстары, Англія.

**Абрамовіч Хасень Ібрагімавіч** (1924 - 2015) – ветэран, старшыня парафіі ў Клецку.

**Абуневіч** – прозвішча. Распаўсюджанае ў парафіі Рэйжы.

**Абу-Бякір,** Абу Бакр – імя бліжэйшага паплечніка прарока Мухаммада ﷺ і першага з чатырох праведных халіфаў, якія кіравалі пасля яго смерці.

**Адам** – імя першага чалавека, праайца чалавецтва, які быў і першым прарокам.

**Адаманцы** – паселішча ў Літве. Належыць да парафіі ў Рэйжах. Некалькі маёнткаў Халецкіх, Туган-Бараноўскіх, Шчансновічаў, Юзэфовічаў і г.д. Два нядзейныя мізары.

**Адамовіч** – прозвішча. Распаўсюджанае ў Мядзелі, на Пастаўшчыне, у Крушынянах.

**Адамовіч Алей Адамавіч** (1853 - 1945) – імам у Мядзелі. Нарадзіўся ў Санкт-Пецярбургу, дзе ягоны бацька служыў імамам. Займаў пасаду імама ў Мядзелі да канца вайны.

**Адамовіч Якуб Аляксандравіч** (1923 - 2014) – в.а. імама ў Мядзелі і Паставах. Сын папярэдняга імама. Атрымаў у г. Уфа афіцыйны дазвол на рэлігійную дзейнасць пасля вайны. Перапісчык рэлігійных кніг.

**Адамовіч Ян Хусэйнавіч** (1955) – старшыня татарскага аб’яднання Польшчы.

**Адамоўска** – аграсядзіба ў Мядзелі. Уладальніца Ліля Мухля. Першапачаткова належала дзеду Лілі – Смольскаму Адаму Хасеневічу, які выконваў абавязкі імама ў Мядзелі пасля вайны. Знаходзіцца на вуліцы Міра.

**Азан** 1) заклік да малітвы (намазу). 2) малітва падчас надання імя дзіцяці, асновай якой з’яўляецца гэты заклік.

**Азербайджан** – краіна ва ўсходнім Закаўказзі. Да Першай сусветнай вайны татары працавалі ў Азербайджане на мытні (Міхаіл Талькоўскі), у адукацыі (Мяр’ема Сулькевіч – кіраўніца жаночай вучэльні, Мяр’ема Хасенеўна Гямбіцкая – настаўніца). У 1918 г. большую частку ўраду Азербайджана складалі татары-выхадцы з Беларусі. Кіраўніком быў Магамет (Мацей) Сюляйманавіч Сулькевіч. У міжваенны час тут жылі Крычынскія з Каскевічаў, у адукацыі працавалі Джаміль Александровіч (Насыфі), Амар Байрашэўскі і інш.

**Азраіл** – імя анёла смерці. У Кур’ане не згадваецца, толькі як “анёл смерці” (*malak ul-mawt,* 32:11)

**Азулевіч** – татарскае прозвішча. Валодалі землямі ў Некрашунцах, Студзянцы, Панарах, Скірсаболях.

**Азулевіч Якуб Аляксандравіч** – палкоўнік, кіраўнік 6 палка пярэдняй варты ВКЛ, у Касцюшкі, загінуў падчас бою за Вільню, пахаваны ў Студзянцы.

**Азыма** – жаночае імя. Формы – Зіна.

**Азюль** – імя. Распаўсюджанае на Паазер'і і ў Літве, у Смілавічах.

**Айсіч** – татарскае прозвішча. Згадваюцца ў Пітkeніках і Сорак татар у 17 ст.

**Айша** – жаночае імя. Формы – Альжбета, Шута, Зюня, Ліза.

**Акменішкі** – маёнтак. Уладальнік Мустафа Абу-Талібавіч Мухля. Парафія Некрашунцы.

**Акменіца** ("Камяніца") – назва аднаго з 6 мізараў у в. Рэйжы. Знаходзіцца ў гаі за 200 м. на поўнач ад дзейнага мізара. Сляды камянёў.

**Аколіца,** ваколіца – агульная назва прадмесцяў пры гарадах, мястэчках і вёсках. Часам называлася "слабада". Татары жылі ў аколіцах Мураўшчызна (каля Іўя), Сандыкаўшчызна (ля Васілішак), Асмолава, Смілавічы, Лукішкі і г.д.

**Аллаг** – імя Бога. Вера ў А., адзінабожжа *(таўхі́д)*, з'яўляецца асноўным прынцыпам Ісламу. Таухід азначае веру ў А. і адмаўленне ў Яго супольнікаў (раўні). Вернік ад усяго сэрца пацвярджае існаванне і адзінства А., адсутнасць у Яго супольнікаў, памагатых і тых, хто мог бы быць падобны або роўны да Яго. Вернік прызнае і звязвае з Ім усе Яго імёны і *сыфа́ты* (Боскія атрыбуты, унікальныя рысы).

А. стварыў сусвет з нічога і кіруе ім. Менавіта Ён стварае ўсё існае, ажыўляе і пазбаўляе жыцця, а пасля смерці ўсяго жывога – зноў верне яго да жыцця. А. адзін, і няма бога, вартага пакланення, акрамя Яго. Ён не нараджаўся і не быў народжаны. Усё мае патрэбу ў Ім, а Ён ані ў кім і ані ў чым патрэбы не мае, у тым ліку, існуе па-за межамі часу і прасторы. У Яго няма падабенства і няма супольнікаў. А. – Валадар велічы, неабмежаванай улады, магутнасці і сілы, Ён можа абсалютна ўсё. Ён вечна Жывы. Яго існаванне не мае ні пачатку, ні канца. А. усё бачыць, усё чуе і ведае ўсё і нічога не забываецца. Нічога не адбываецца б без Яго ведама і дазволу (аднак Ён незадаволены грахамі і нявер'ем, любым непаслушэнствам Сваіх рабоў). Ён здольны прабачыць любыя грахі (акрамя нявер'я), толькі Ён настаўляе на шлях праўдзівы, дае веру вернікам і можа пазбавіць яе тых, хто ставіцца да яе без пашаны. Ён даруе *рызк* (долю, пажытак) Сваім рабам, дапамагае ім, аберагае іх. І Ён таксама аддаляе ад Сваёй ласкі і карае тых, хто зацята трымаецца за шматбожжа (політэізм, паганства, *шырк*), тых, хто свядома адмаўляе ісціну і абірае нявер'е. Чалавек, які верыць у А., жыве з усведамленнем, што Ён заўжды бачыць яго і чуе, клапоціцца аб ім і надзяляе ўсім, ведае пра кожны яго рух і аднойчы спытае аб усіх яго ўчынках. Вернік павінен весці

жыццё ў адпаведнасці са сваёй верай і ва ўсіх сваіх намерах і жаданнях кіравацца імкненнем да Боскага задавальнення.
**Алей,** Алі – імя зяця і стрыечнага брата прарока Мухамада ﷺ, які стаў чацвёртым праведным халіфам. Адно з найбольш распаўсюджаных імёнаў сярод татараў.

**Александровіч** – адно з найбольш распаўсюджаных прозвішчаў сярод татараў ВКЛ. Некалькі асобных родаў з уласнымі гербамі.

**Александровіч Адам Мустафавіч** – імам у Нью-Ёрку. Нарадзіўся ў Клецку.

**Александровіч Айша Браніславаўна** – мастачка, выкладчыца ў БНТУ, дызайнер строяў.

**Александровіч Алі Адамавіч –** ветэран, палкоўнік міліцыі ў Докшыцах, старшыня парафіі ў Докшыцах. Нарадзіўся ў Клецку.

**Александровіч Ісмаіл Мустафавіч** – муфтэй, імам, архітэктар. Нарадзіўся ў Клецку ў сям'і імама.

**Александровіч Сцяпан Хусэйнавіч** – пісьменнік, партызан, ветэран. Нарадзіўся ў Капылі.

**Александровіч Хасень Мустафавіч** – доктар хімічных навук, ветэран ВАВ. Нарадзіўся ў Клецку 20 красавіка 1924 г.

**Аліевіч** – татарскае прозвішча, распаўсюджанае ў Лоўчыцах і Наваградку.

**Аліевіч Асан Газеевіч** (1841) – губернскі сакратар.

**Аліевіч Газей-Магамет Рамазанавіч** (1740) – імам у в. Сорак татар у 1795.

**Аліевіч Ібрагім Сюляйманавіч** (1912 - 2008) – імам у Нью-Ёрку.

**Аліевіч Самуіл Іванавіч** (1905 - 1991) – старшыня парафіі ў Нью-Ёрку з 1938.

**Аліевіч Самуіл Якубавіч** (1804 - ?) – імам у Багоніках з 1846 да 1876.

**Аліевіч Ян Сюляйманавіч** (1793 - ?) – імам у Крушынянах з 1836 да 1879.

**Аліта** (Alytus) – горад у Літве. Татарская парафія з 1991 года. Старшыня – Іпаліт Макуловіч.

**Аляксшышкі** – першапачаткова маёнтак Рамановічаў. На сённяшні дзень вёска. Парафія Некрашунцы, гміна Нача, Воранаўскі раён. На сённяшні дзень жывуць прадстаўнікі роду Крыніцкіх.

**Амбаеў** – прозвішча татараў з Паволжа. Імам у г. Коўна падчас Першай сусветнай вайны быў Ібрагім Амбаеў, потым муэдзін. Меў некалькі жонак, у тым ліку Аміню Якубоўскую і Асановіч з Таўсюнаў. Меў больш за 10 дзяцей. Найбольш вядомыя нашчадкі – муфтэй Літвы Ромас Якубаўскас.

**Амбасада** – пасольства адной краіны ў другой. Сярод татараў было некалькі чалавек, якія працавалі ў амбасадах розных краін у розны час. Сабалеўскі Раман Магаметавіч з Іванава быў паслом Польшчы ў Кітаі. Хазбіевіч Сялім Эміравіч (карані з Арды і Вільні) – пасол Польшчы ў Казахстане і Кыргызстане. Якубоўскі Хасень Аляксандравіч – сакратар пасольства СССР у Парыжы. Багдановіч Леон Сюляйманавіч – пасол Польшчы ў Алжыры.

**Амбросавічы** – татарскае паселішча ў Глыбоцкім раёне Віцебскай вобласці. Некалькі асобных хутароў Ільясевічаў, Смольскіх і Якубоўскіх. З'явіліся ў канцы 19 ст. Апошні будынак знесены ў 2020. Мізар заснаваны ў 1919. Належыць парафіі Глыбокае.

**Амбросавіцкі мізар** – дзейны мізар у былым паселішчы Амбросавічы. Заснаваны ў 1919 годзе. Першы пахаваны – Алей Ільясевіч, уладальнік земляў у Амбросавічах. Мізар належыць парафіі Глыбокае. Каля 200 пахаванняў – Якубоўскія, Шчуцкія, Смольскія, Радкевічы, Паўтаржыцкія, Мураўскія, Мількамановічы, Мейшутовічы, Лебедзі, Канапацкія, Ільясевічы, Гямбіцкія, Базарэвічы, Асановічы і інш.

Сваімі падкопамі і ліхаслоўем яны нявінных людзей забіваюць, ілжывымі довадамі яны любога з прамога шляху збіваюць. Сумленнасці у іх нямнога, несумленнасць – вось іх пастаянная дарога. Яны сваім ліхаслоўем сорам у слухача выклікаюць, праз слова яны каго-небудзь праклінаюць. Гожаму мужу, падобнаму да царэвіча, яны зло сваімі здрадамі прычыняюць, а са страшным палюбоўнікам, падобным на д’ябла, яны вельмі ветлівыя і ласкава яму дагаджаюць. Надзеўшы чадру, яны дзёрзкім падманам займаюцца, а прыбраўшыся, пералюбнічаць адпраўляюцца. Сетка выкрутаў іх падобная павуціне, ніхто не зразумее сутнасці іх падкопаў.

У ліку такіх, як яны, і лядашчая старая, якая свой твар, падобны на стары бурдзюк, фарбуе румянамі, а сваю галаву, што трасецца, аздабляе пышнымі султанамі. Лепш было б, калі б абрынулася скала і з плячэй тую галаву зняла.

Нават плюгавая старая ўсё адно хоча прыбірацца і душыцца, патрабуе збрую з каштоўнымі камянямі нават старая асліца.

Іх мужы – гэта рабочыя аслы, што ім мусяць дагаджаць, бездапаможныя слугі, а дакладней – халопы, што іх глядзяць.

Паколькі ўсе людзі розныя, то і жанчыны адна ад адной таксама зусім адрозныя. Але іх можна падзяліць на тры роды – простых жанчын, прывілеяваных жанчын і высакародных жанчын.

Простыя нібыта жывёлы жывуць, яны толькі спяць, ядуць і п’юць. Фарбавацца і прыбірацца – гэта іх богаслужэнне, упрыгожвацца і малявацца – такое іх маленне. Іх дэвіз – веры не ведаць і не знаць, мэта іх – сваімі падкопамі як мага больш дрэннай славы прыдбаць.

Прывілеяваныя жанчыны нібы д’ябал і шайтаны невыносныя, яны падступныя і злосныя. Для іх добры намер – прыгнятаць і зло пасяліць, для іх сумленная і набожная справа – строіць падкопы і здрады чыніць. У параўнанні з імі злы дух у вераломстве і падступнасці няўмелы, а д’ябал у выхадках і хітрыках нясмелы. У параўнанні з імі анёлы слабыя, а чэрці дурныя.

Сем’і руйнаваць для іх такая ж высакародная справа, як храм будаваць, кроў нявінных людзей праліваць для іх такая ж ласка, як мёртвых уваскрашаць. Калі хтосьці аказвае ім дабро, яны яго да зла кіруюць, таго, хто ім дае мёд, яны атрутай частуюць. Яны руйнуюць дом цноты і гонару, ламаюць будынак пабожнасці і разганяюць сумлення водары.

Дасведчаныя ў многіх навуках навукоўцы, дасціпныя і ўважлівыя мудрацы напісалі пра іх падступства мноства кніг, і можна падумаць, што яны ўсё падрабязна апісалі, аднак самі яны мяркуюць, што яшчэ не выказалі ўсё. Як жа мог я пра іх напісаць ў гэтых некалькіх разрозненых старонках? Не мог я закрануць і сотай часткі іх учынкаў.

Высакародныя цалкам супрацьлеглыя тым, каго я толькі што апісаў. Яны праўдзівыя, ведаюць толькі праўду, увесь час узгадваюць Пана Бога як языком, так і сэрцам. Навукоўцаў веры яны навучаюць, ад іх подыху вялікія святыя карысць набываюць. Такіх жанчын Божыя Пасланцы і Прарокі ўсхвалялі, лічачы іх сёстрамі набліжаных да іх анёлаў. Галаву сваю яны пакрываюць покрывам цноты, а свой твар – шоўкам жаночага гонару. Хай не здыме з галавы такой хусцінку Пан Бог, хай не зніме гэтага покрыва з такога твару злы рок, няхай не ступіць загана на яе парог.

## Аб крывадушных шэйхах

Самахвальства крывадушнага шэйха – гэта пазалочаная медзь, здольная толькі звонку бліскацець. Ён пабожным толькі выглядае, а знутры яго ашуканскія выбрыкі напаўняюць.

Ён вычварна апранаецца, каб прыцягваць увагу простага люду, каб ачмураць людзей, чыніць шарлатанскія “цуды”. Чалма яго поўная імкнення да ўлады, кожны волас у яго – распуснасць і здрада. Стракаты халат, які ён носіць, аб стракатасці яго хітрыкаў галосіць.

Ён прыкрывае заганы сваім бурнусам, кожная нітка якога спрадзена на прасніцы крывадушнасці хлуса. Яго зубная шчотка – гэта напільнік, якім ён зубы сквапнасці точыць, у чахле грэбеня схаваныя прылады, якімі ён людзей з панталыку збіць хоча.

Ён перабірае ружанец для адводу вачэй, моліцца напаказ усіх даўжэй. На галаву ён накручвае велізарную чалму, каб лепш акручваць людзей, на хвост лісы падобны пас чалмы, які ён імкнецца зрабіць чым даўжэй. Ён не да месца чуве́е[22], нібы раптам здурнеў, яго лямант – гэта кудахтанне курэй. Іншыя вакол яго круцяцца ўраганам, нібыта п’яныя ў зборышчы п’яным.

Не ад душы ўсё, што ён гаворыць, мае на карыслівыя мэты ўсё, што ён робіць. Цуды, якія ён робіць, паскудства; усё тое, што ён пра цуды кажа, гэта глупства. Яго спевы пазбаўлены рытму і строю, ён ва ўсім прытворства кроіць. У знешнасці яго пышнасці многа, але змястоўнага няма ў ім нічога.

І гэты мярзотны чалавек у прыгожым адзенні сябе з набожнымі людзьмі ставіць мае надзею. Гэта вялікі сорам.

І ўсё ж-такі людзі прыходзяць да яго, каб стаць яго мюрыдамі і яго слухаць, яны фанатычна і самааддана яму служаць. Ён захоўвае свой уплыў махлярствам, падманам пад сваёй уладай трымае паству. Самі чэрці бянтэжацца ад яго ўчынкаў, разгубіўся нават Ібліс злачынны.

***Рубаі:***

*Пад покрывам беднасці тут столькі крывадушша, ханжаства, шахрайства:*
*Бывае так – пляце цыноўкі на пасадзе сам ўладыка царства,*
*Калі ханжа заве сябе дэрвішам, а той цар сябе заве царом,*
*То розуму няма ў абодвух, і сумленне ў іх змянілася нядбайствам.*

## Аб гуляках

Заўсёднік шынка – то апі́лы гуляка – бавіць час за келіхам без нічога ніякага.

У галаве яго да віна цяга пануе, ён, нібы хмель, толькі ля куфля начуе.

Калі ён даведаецца, што дзесь баляванне віруе, ён дастаўляе туды пляшкі з віном і там балюе.

Чалму гонару кожнае імгненне ён з галавы зняць гатовы, за глыток віна ён да ног чашніка ўпасці гатовы. Ён вар’ят, бо звязаны з шынком, ён бедны, бо любіць адно келіхі з віном.

Калі ён з рук чашніка чару віна выпівае, ён сябе мацнейшым і шчаслівейшым за Джамшыда[23] адчувае.

Ён пакланяецца чашніку, прыгажосці яго твару, ён падае ніцма ля ног прадаўца хмельнага тавару.

---

[22]Чуванне – (рус. радение), духоўная практыка, звязаная ў ісламе з прамаўленнем зікру ўслых, а ў некаторых плынях – і з пэўнымі рухамі.

[23]Джамшыд – легендарны багатыр

Жартаўнікі-п’яніцы парвалі яго кашулю, ён жа з-за любові да іх ног пад сабой не чуе. У мейхане[24] ён падае пабітую чару і просіць у яе наліць віна. Ён цалкам стаў на ганебны шлях, не адзін п’яны збівае яго дома і ў гасцях. Ён просіць у вясёлым сходзе, каб яму ля дзвярэй месца далі, жадаючы, каб яго самалюбства растапталі. Ён не абцяжарвае сваю галаву чалмой, не турбуе халатам стан свой.

Але хоць ён як асоба з зямлёй мяшаецца, але дзякуючы сваёй велікадушнасці ён да нябёсаў уздымаецца[25]. Ён не сумуе ад бедстваў, якія прыносіць час, не пакутуе ад непасільнага цяжару, як кожны з нас. Ні жыццё, ні смерць яму не страшныя, паміж заможным і немаёмным розніца яму не бачная. Яго суцяшэнне – праліваць горкія слёзы; нібы пляшка, ён рады быць падобным да чары з віном. У карчме ён і аднаго імгнення цвярозым не бывае, на сегасветнае дабро і зло ён не паглядае. Ён не разбіраецца ў тым, што добра, а што дрэнна. Можна сказаць, што гэта не чалавек, а сапраўдны цуд. Ён прывык з несправядлівасцю і з цяжкім жыццём мірыцца, мэта яго – прабачэння і міласці Госпада дамагчыся і Яго ласкай наталіцца. Ён губляецца ў пыле карчмы быцця мірскога, спадзеючыся атрымаць вечнае жыццё ад Пана Бога. Гуляка і немаёмныя шчаслівы ў гэтым, так што ім могуць пазайздросціць і цары гэтага свету.

***Рубаі:***

*Гуляка п’е віно штодзённа адно з кілішка небыцця,*
*Ад свету ён не хоча плёну,  і ад магільнага жыцця.*
*Адзін спадзеў на ласку Бога і дзень і ноч трымае ён,*
*Ён лепшы, чым аскет, што псуе таемна святасць Адкрыцця.*

Хай усім няшчасным усміхнецца такое шчасце без пакарання, хай яны заслужаць вечнае жыццё шляхам пакаяння.

## Аб дэрвішах-суфіях

Дэрвіш – той, хто прывык з усім мірыцца, і нават калі цяжка на душы, быць добрым і не сварыцца. Дэрвіш павінен правільнага шляху да Ісціны трымацца, паказваць сябе такім, які ён ёсць, і не выхваляцца. Каб ачысціць сябе ад бруду жарсцяў, ён павінен выпрабоўваць сябе суровай галечай, зняможваць сваё цела, ісці шляхам устрымання і дасягнуць гэтым шляхам палаца дасканаласці.

Нікога, акрамя Аллага, не будзе заўважаць зрок яго; акрамя абсалютнага быцця, ён не будзе бачыць нічога – ні чужога, ні свайго. Нутро яго будзе адпавядаць знешнасці. Сэрца будзе супадаць з аблiччам. Хоць бы і сапсавалася знешнасць, каб схаваць свой унутраны свет, гэта не будзе перашкодай духоўнай дасканаласці. У дэрвіша ірваны халат, поўны выцвілых фарб – у руінах знаходзіцца скарб. Дасканалы муж дрэнна апранаецца – скарб цара Фарыдуна ў руінах хаваецца. Рэчаіснасць людзей зместу – гэта таямніца нявыказанага слова, рэчаіснасць людзей формы – гэта ўдаванне, у якой зместу не адшукаеш нават выпадкова.

Сапраўдныя мужы свой сапраўдны ўнутраны свет хавалі і прадметам асуджэння людзей бывалі. Яны разбуралі знешняга выгляду будынак, а ўзмацнялі ўнутранага свету падмурак. Яны былі задаволеныя ўсім, што пасылаў ім рок, не выклікалі іх незадаволенасці цяжкі прыгнёт і людскі папрок. Яны не елі, не пілі, ад усяго зракаліся і дзеля Госпада свайго перажывалі гора, і крывавымі слязьмі абліваліся. Куток згоды і

---

[24] Мейхана – шынок.

[25] Тут і да канца раздзелу Наваі выкарыстоўвае вобраз бесклапотнага гулякі як алегорыю сапраўднага багамольца, верніка, які цалкам аддае сябе Богу.

задаволенасці – вось іх прыстанак, пустыня пазбаўлення і ўстрымання – вось іх суцяшальнік і загойванне ранаў. Яны выхаваныя і велікадушныя, сябру і ворагу жадаюць толькі дабра.

Хто мае гэтыя якасці, той – дэрвіш.

***Рубаі:***

*Прашу цябе, Магутны Божа, нябыту птушку прыручы*
*Ці у сетку мне злавіць дазволь і Тваім мастацтвам навучы.*
*Дарогі беднасці спазнаў я, і шчасце ў гэтым для мяне.*
*Мяне, няшчаснага, у прыстанак нябыту Свой Ты заключы.*

## РАЗДЗЕЛ ДРУГІ. ПРА ДОБРЫЯ УЧЫНКІ І ДРЭННЫЯ ЯКАСЦІ

### 1. Аб пакаянні

Сапраўднае пакаянне *(таўба)* палягае ў тым, каб зразумець, наколькі дрэнныя злыя ўчынкі, апомніцца і прамым шляхам крочыць, з Вышняй дапамогай з кепскага шляху збочыць. Люстэрка сэрца грэшнага чалавека пакаянне пыл ерасі змятае, губка малітвы гэта люстэрка да бляску націрае.

Пакаянне – гэта канец сцежкі бедстваў і пачатак дарогі Ісціны; яно заключана ў тым, каб ад уласнага невуцтва аддаліцца, ад сну чалавечага жыцця абудзіцца; свае непрыстойныя паводзіны зразумець, імкненне да дурных дзеянняў ў сябе здалець; яно заключаецца ў тым, каб зразумець наступствы нядобрых учынкаў і зразумець сваіх дамаганняў злачыннасць; пакаянне – гэта з-за нізкіх учынкаў збянтэжанасць, ад сваіх правінаў сарамлівасць; пакаянне – гэта ўсведамленне чэрствасці людской прыроды і прыхамацяў сваіх мярзоту; яно і ў тым, каб спыніць самавольнасць сэрца і спыніць свавольства душы; гэта – часіна выратавання нябеснага, адмова ад асалоды цялеснай.

Гэтая бліскучая жамчужына не кожнаму нябогу дастаецца, карыстацца гэтай паходняй дапамогі Усемагутнага Напраўніка не кожнаму ўдаецца. Калі чалавек з высакароднай натурай з правільнага шляху збіваецца, калі чалавек з набожнай існасцю забываецца, ім авалодвае нейкі шал, прычынай якога з'яўляецца жорсткі запал. Потым на яго сыходзіць нябесная дапамога і да яго вяртаецца прытомнасць па волі Бога. Пасля гэтага жыццё яго гняце, сорам цісне яго ў бядзе. Ён устрымліваецца ад грэшных спраў і просіць прабачэння, моліць аб грахоў ранейшых адпушчэнні. Ён свае памылкі выпраўляе і на прамы шлях выступае.

Гэты этап – першая ўдача суфія, першы прыпынак падчас Падарожжа да мэты. Гэтага шчасця чалавек сам па сабе ніяк здабыць не зможа, *"гэта – ласка Аллага, якую Ён пасылае таму, каму захоча"*[26]. Кожны шчаслівец тым ці іншым шляхам становіцца такім дасведчаным, кожны шчасны неяк дасягае гэтага шчасця.

***Рубаі:***

*Хто ад Пана Бога ласкай быў надзелены хоць раз,*
*Хай нявартай справай будзе неяк апаганены на час –*
*Ў рэшце рэшт памылку ўбачыць, знойдзе шлях загладзіць грэх,*
*Зноў па той дарозе пойдзе, што шукае кожны з нас.*

---

[26]Кур'ан, 57:21. "Імкнецеся ж да даравання вашага Госпада і Рая, шырыня якога нібы шырыня неба і зямлі. Ён падрыхтаваны для тых, хто паверыў у Аллага і Яго пасланцаў. Такой ёсць ласка Аллага, якой Ён надзяляе, каго пажадае. Аллаг – валадар вялікай ласкі".

## Аповяд пра раскаянага грэшніка

Увасабленне нябеснага мастацтва, няхай асвеціць Усявышні яго таямніцу, Абдула ібн Мубарак сваё пакаянне і шлях Ісціны пачаў так. Ён быў у прыгажуню з тварам, як у перы, закаханы і мянушкай шаленца ад людзей названы. Хараство хітрай прыгажуні яго паланіла, і розум яго пайшоў з уладанняў сэрца, не маючы сілы.

Аднойчы ў зімовую ноч ён сваю каханую ля яе агароджы чакаў і ў марах аб спатканні з ёй нічога не чуў і не адчуваў, хоць хмара пасылала з неба на зямлю снег густы, і ад гэтага мускус ночы змешваўся з камфарай, снежная завея была падобная на набег войска кахання на краіну сэрца, а лісце дрэва, акалелае ад моцнай сцюжы, нагадваў маўклівыя языкі закаханых.

Але Ібн Мубарак не адчуваў нічога ад жару кахання спацелы, снег і сцюжа не дзейнічалі на яго расхрыстанае цела. Ён прастаяў да таго часу, пакуль певень, заклікаючы прачнуцца, не пракрычаў, пакуль муэдзін да ранішняй малітвы не прызваў. Калі ён пачуў муэдзіна голас, ён падумаў, што пачынаецца вячаровы намаз. Але калі паказалася зара і неба праяснілася, яго сэрца стала турбавацца, нібы ў ім сонца з'явілася. Ранішні прамень душу яго асвятліў, Натхняльнік ісціны на яго свет праліў.

Пасля таго як ён ачуняў, ён звярнуўся сам да сябе: “Гэй ты, няшчасны сын Мубарака стараннага, няўдзячны мізэрны раб Бога Ласкавага, калі імам падчас вячэрняга намаза вялікую суру чытае, галаву тваю брудныя думкі напаўняюць, а нуда душу не пакідае. Але з-за сваёй бяздольнай жарсці, дзеля прыхамаці сваёй злой натуры, ты нібы вар'ят блукаеш, доўгую ноч халоднай зімы без сну прабаўляеш, ранішнюю зару ад вечаровай не аддзяляеш”.

Сэрца яго ад жуду ў грудзях спыніцца захацела, душа ад сораму стала выходзіць з цела. Але Пан Бог аказаў ласку, шлях да раскаяння душы яго паказаў, ён стаў сябе выхоўваць ды навучаць і здолеў у Меццы шэйхам шэйхаў стаць. Хай выведзе Госпад Усемагутны на гэты праўдзівы шлях любога, хай усім Ён пашле шчасце пакаяння такога.

***Кыта:***

*Праз моц раскаяння і даравання браму*
*Халопскі сын ўзыходзіць да нябёс,*
*Цары пры ім становяцца рабамі –*
*Адзіны шлях да высяў даў нам лёс.*

## 2. Аб падзвіжніцтве

Падзвіжніцтва *(зугд)* – гэта ўсіх сегасветных выгод забыццё, ад усіх прыхамацяў адрачэнне; гэта значыць вырваць з сэрца мару пра багацце і пасады, разбіць куміра самапакланенне ў пыл; гэта значыць – з надзеяй галечы сябе падвяргаць, усе дамаганні капрызаў сваіх забываць; гэта значыць – дарогай закона мужна ісці, з велізарнай любоўю рухацца прамым шляхам, каб ісціну знайсці; гэта значыць – не класці напаказ зямны паклон, думкі аб такім набажэнстве выкінуць з галавы вон; гэта значыць – зрок ад пагляду на чалавека процілеглага полу зберагчы, язык ад непрыстойных слоў сцерагчы; гэта значыць – затуліць вушы ад людскога марнаслоўя, утрымліваць рукі ад сегасветных учынкаў недазволеных; гэта значыць – не станавіцца на шлях наведвання людзей бяздумных, не паўтараць чужых слоў тлумных; гэта значыць – запячатаць постам рот і не ўжываць нічога з таго, што хоча чалавечы жывот; гэта значыць – камфарай боязі Бога прымусіць сябе не рабіць з таго, што выклікае цягу да процілеглага полу, нічога; гэта значыць – есці як мага менш, трымаць чысціню ежы як мага больш; гэта значыць – увесь

час сябе ад натоўпу адасабляць, з людзьмі марна не балбатаць; гэта значыць – па начах маліцца пастаянна, паўтараць імя Пана Бога без перастанку.

Калі аскет на прыступку падымаецца, яго прырода святлом выбаўлення ад бруду жарсцяў ачышчаецца. Святло пазнання яго сэрца акідае, ззянне гэтага святла яму радасць дастаўляе. Пачынае прыносіць плён яго маленне, пачынае прыводзіць да добрых вынікаў яго адрачэнне, а сам ён з кожнай хвілінай руплівей і руплівей за справу бярэцца, сэрца міг за мігам мацней б’ецца.

Ён спусташае чарку за чаркай ласку, але не напіваецца, асушвае куфлі захаплення, але не насычаецца. О Божа, прыспор гэты келіх тым, хто прагне, здаволь смагу на гэтым шляху сасмаглых, пачцівых, Пане Божа, бо Ты Шчодры і Літасцівы.

***Бэйт:***

*Тым, хто пойдзе шляхам Праўды, хлебам надзялі яго,*

*Тых, хто гэтага жадае, ацалі іх ад нягод.*

## Аповяд пра падзвіжніка Шамс ад-Дзіна

Правадыр мужоў ісціны, маўляна Шамс ад-Дзін, які жыў у адным з селішчаў вілаета[27] Джам, цягам трыццаці год пазбаўляў сябе ўсіх сегасветных выгод. Па начах ён маліўся, а днём – поснікаў. Ён увесь час у кутку пакойчыка пры мячэці пражываў, выходзіў адтуль толькі тады, калі ўмыванне здзяйсняў. Ён ад людзей ані не браў, па чарзе зуб за зубам вырываў, на працягу трыццаці гадоў у яго пад бокам была адна цыноўка, а пад галавой – адзіная цагліна.

Кічык Мірза, праходзячы праз гэты вілает, пачуў пра гэтага шаноўнага чалавека і зайшоў яго адведаць. Калі ён увайшоў у тую мячэць, маўляна сядзеў у паношаным халаце і ў старой шапцы, ды па твары яго нельга было сказаць, што ён у чымсьці мае патрэбу. Мірза расчуліўся і паднёс яму жменю манет, але маўляна адмовіўся узяць іх і прамовіў наступныя словы: “Паколькі я прывык жыць так, мне анічога не трэба. Калі гэтыя грошы мне браць, скажыце мне, што я буду з імі рабіць і куды дзяваць? Мне хапае невялікай долі тых сродкаў, што ідуць на аднаго вашага слугу. Я вам вельмі ўдзячны, але не, будзьце ласкавы, прабачце мяне!”

Кічык Мірза нічога не мог сказаць, заплакаў, зрабіў зямны паклон[28] і пайшоў. Ён сам – ласка яму Божая – мне пра гэта распавядаў.

Праз пэўны час я, мізэрны гаротнік, таксама меў гонар наведаць маўляну і быць сведкам таго, што яго паводзіны адпавядаюць таму, што пра яго распавядаюць, і нават пераўзыходзяць гэтыя апавяданні. Хай надзеліць Пан Бог Усявышні і ўсіх, хто мае патрэбу, і жадаючых таго духмянасцю гэтага кветніка і водарам яго пахкага мурогу.

***Бэйт:***

*У сэрцы у каго агонь любві палае, той, хто да беднасці імкнецца,*

*Хай без надзеі Бог яго не пакідае, хай ён на Бога спадзяецца.*

## 3. Аб спадзяванні на Бога

Надзея *(таваккуль)* – гэта выдаленне ўсіх сродкаў на шляху, які вядзе да Праўды, гэта зняцце заслоны прычын; гэта азначае – адмовіцца ад пасярэдніцтва прычын і звярнуцца да беспрычыннай першапрычыны.

---

[27]Вілает – адміністратыўна-тэрытарыяльная адзінка дзяржавы, рэгіён, вобласць.

[28] Відавочна, маецца на ўвазе *саджда-шукру* – паклон удзячнасці, які робіцца Богу за Яго ласку. Кічык Мірза зразумеў, што аскетызм у тым ліку і ў тым, што чалавек не мае патрэбы ў чымсьці іншым, акрамя Божай ласкі і ў якасці падзякі за ўрок зрабіў паклон Богу.

Ва ўсемагутных руках лёсу прычына – гэта гнілая нітка, перад ззяннем паходні наканавання блякне іскра сродку. Прыхільнікі спадзявання, якія на шлях Ісціны выступаюць, дарожнага пажытку са шчодрага стала Пана Бога чакаюць. Тыя, хто валодае дасканалым спадзяваннем, сілкуюцца з нябесных сталоў, яны п'юць з кубка ласкі Божай, і іх адзенне выдаецца з казны нябесных дароў.

Хоць плаванне на караблі з'яўляецца прычынай, якая дазваляе нам перасягнуць мора, ёсць людзі, якія не замачыўшы ног, могуць хадзіць па вадзе без бяды і без гора; хоць верхавыя жывёлы лічацца сродкам, з дапамогай якога можна перайсці пустыню, ёсць такія людзі, якія могуць пешкі абысці ўвесь свет і не загінуць.

Ніхто іншы не зможа з'есці ежу, якая з'яўляецца тваім пажыткам, а ты не здолееш з'есці тую страву, якая была дадзена доляю іншага. Твой хлеб надзённы будзе належаць табе, а іншы сваю долю возьме сабе. Калі нават вы не хочаце гэтага, лёс вам гэта прынясе, і калі вы нават не думалі есці, ён вас прымусіць і з'ясце.

Тыя, хто спасціг гэта, не пераймаюцца з-за здабыцця пражытку, яны не сеюць хлеб, каб дасягнуць дабрабыту. З-за недасканаласці спадзявання людзі, каб здабыць хлеб надзённы, займаюцца рамяством і штукарствам, з-за няпоўнага разумення Ісціны яны зарабляюць на сваё жыццё працай марнай. Не думае аб галоднай смерці той, хто спасціг, што корміць яго Ўсемагутны Пан, не выказвае незадаволенасці сваёй доляй той, хто ведае, што долю размяркоўвае Бог Сам. Хіба табе не дасць ежу Той, Хто корміць звяроў і птаства, хіба цябе не надзеліць Той, ад Каго атрымліваюць пажытак жыхары мурашынага царства?

Той, хто жадае прызначаную Небам долю сваю павялічыць працай, той спрабуе нітку дажджу завязаць вузлом і злавіць, той, хто імкнецца сваімі высілкамі загаданы Небам лёс змяніць, той хоча па зямлі на караблі плаваць, баючыся ногі замачыць. Так робяць тыя, сэрцы якіх святлом разумення першапрычыны не асвечана, духоўны зрок якіх ад сонца Ісціны не абудзіўся, а спіць прыгнечана.

Мужы спадзявання адмовіліся ад усіх прычын і вынікаў, і рушылі шляхам спадзявання на Аллага. Яны ведаюць, што Госпад хлебам надзённым надзяляе і есці яго прымушае. Яны з дарогі рабаўнікоў – сумнеў і нерашучасць – прагналі, і шляхам спадзявання Каабу мэты засталі.

***Бэйт:***

*Хто абраў дарогу веры, хто прыйшоў у тарыкат,*
*Бліскавіца іх не спаліць, бура ў моры – Райскі сад.*

## Аповяд пра спадзяванне паломнікаў

Шэйх Ібрагім і адзін з яго мюрыдаў – хай будуць святыя іх таямніцы – пайшлі пешшу шляхам спадзявання у Каабу. Яго светласць шэйх спытаў у свайго мюрыда, ці няма ў яго чаго-небудзь з сабой. Мюрыд шэйху адказаў, што ён выйшаў на шлях спадзявання і пры ім няма нічога. Пасля таго як яны прайшлі некалькі крокаў, шэйх яшчэ раз папрасіў:

– Ты паглядзі лепш і выкінь тое лішняе, што ў цябе ёсць, а то ў мяне нешта ногі цяжка ідуць.

Мюрыд сказаў, што пры ім ёсць некалькі запасных шнуркоў для абутку, якія ён узяў з сабой на выпадак, калі тыя шнуркі, якімі ён замацаваў абутак, парвуцца падчас падарожжа. Шэйх спытаў:

– Але цяпер жа ў цябе шнуркі цэлыя, пакуль яны не рвуцца?

Мюрыд адказаў:

– Так.

Шэйх сказаў:

– У такім разе выкінь усе лішнія шнуркі.

Мюрыд потым распавядаў: “Я не мог адмовіцца, супраць волі выкінуў іх і пайшоў далей. Раптам у дарозе ў мяне парваўся шнурок, я нахіліўся, каб выцягнуць яго, а затым папракнуць шэйха, але тут я заўважыў на зямлі цэлы шнурок. Я здзівіўся, замацаваў свой абутак і дагнаў шэйха. Калі ў мяне з’яўлялася патрэба ў новым шнурку, я штораз знаходзіў яго такім чынам. І так маё спадзяванне дасягнула дасканаласці”.

Мужы спадзявання падарожжа да Праўды вось такім шляхам здзяйсняюць, на ўсялякія сродкі яны ўвагі не звяртаюць.

***Кыта:***

*Як спадзяванне будзе лжывым, дык толькі шкоду прынясе,*
*Спакусай будзе нават дробязь, хто ісцін простых не спасціг.*
*Калі вы шчырыя, то можна Кару́на[29] скарбы ўзяць усе,*
*А падарожнік тарыката да Праўды пойдзе міма іх.*

## 4. Аб задаволенасці малым

Задаволенасць малым *(канаат)* – гэта значыць у дастатковай для малітвы колькасці ежу прымаць і больш ні аб чым не бедаваць; гэта значыць, збядняючы сябе, запал зніжаць, шляхам выпрабаванняў пажаду аслабляць.

Задаволенасць малым – гэта крыніца, вады ў якой не змяншаецца, колькі б яе ні бралі; гэта казна, у якой манеты не канчаюцца, колькі б іх не раздавалі; гэта ніва, на якой расліны гонару і велічы растуць, гэта дрэва, галіны якога плады незалежнасці і пашаны даюць.

Задаволенасць малым радуе душу людзей, яно праясняе зрок вачэй. Чэрствы хлеб задаволенага малым дэрвіша лепш за пышны стол цара прагнага, і посная поліўка незалежнага, хай сабе і небагатага, лепш тлустай стравы багацея – залежнага, хоць і прыбранага.

Цар той, хто дае, але не бярэ, жабрак – той, хто бярэ, але не дае. Той, хто здавольваецца малым, будзе да нягод прывыкаць, вызваліцца ад заганных звычак, агульных для цара і для жабрака. Хоць яго дом будзе цеснаватым, ён мае шмат пераваг і лепш за гмахі багатых.

Задаволенасць малым – гэта крэпасць, у якой ты будзеш выбаўлены ад прыхамаці злачынных кіпцюроў, гэта горная вяршыня, на якой ты не будзеш залежаць ад ворагаў і сяброў; гэта сціпласць, вынікам якой з’яўляецца гонар, гэта галеча, якая прыводзіць да свабоды ад патрэбы, гэта насенне, ураджаем якога з’яўляецца маёмасць, гэта дрэва, пладом якога з’яўляецца магутнасць; гэта горкае віно, якое дорыць весялосць, гэта цяжкая дарога, якая прывядзе да радасці вашамосць.

Задаволенасць малым прыносіць многа даброт і аслабляе прагу, а прагнасць прыносіць шмат бедаў і знявагу. Подлы люд мае прагнасць і ліхвярства, такім уласцівыя нізкасць і жабрацтва.

---

[29] Карун – біблейскі Карэй, вельмі багаты чалавек, чые скарбы былі нагэтулькі агромністымі, што нават ключы ад іх маглі падняць хіба некалькі асілкаў. З-за сваёй сквапнасці і нявер’я Карун быў пакараны – разам са сваімі скарбамі праваліўся пад зямлю.

Дзеянні прагнага сарамацяць яго самога, учынкі яго прыносяць яму знявагі многа. Калі ў прыродзе чалавека сквапнасць будзе, ён не спадабаецца іншым людзям. Гэта – світанне подласці і мярзоты, закат дабрыні, чалавечнасці і мілоты.

Сквапнасць – гэта пажар, які спальвае дом сумлення, бура, што пускае па ветры гумно гонару, тушыць светач мудрасці. Чалавек, які на скнарнасць хворы, – гэта тое ж самае, што чалавек, які любіць хціва есці без меры. Скнарлівасць – гэта ўласцівасць подлых людзей, прагнасць да ежы – уласцівасць дзікіх звяроў.

Задаволенасць малым – гэта такая каштоўнасць, якая ратуе людзей ад тых двух бедстваў і выбаўляе ад іх наступстваў. Два віды гэтай подлай прыроды падобныя на брыдкіх блізнят. Яны горш адзін другога, абодва яны горш усяго благога. Адзін подлы, другі – агідны, абодва яны па сутнасці нізкія. Прапаведнік Праўды[30] – хай дабраславіць яго Аллаг і вітае – сведчыў, што задаволены малым – чалавек людзям мілы, а сквапнага – гоняць што мае сілы.

***Рубаі:***

*Хто задаволены малым і толькі Богу служыць,*
*Таго шануюць людзі, той не тужыць;*
*А той, хто ненажэрны, той, хто прагны,*
*Ён прыніжэнне знойдзе, Раю не заслужыць.*

## Аповяд пра шэйха, які задавольваўся малым

Хавальнік Боскіх таямніц шэйх Шах-Зіяратгахі – няхай асвеціць Аллаг яго таямніцу – вырашыў пайсці па шляху задаволенасці малым і пасяліўся ў селішчы Зіяратгах. Ён не браў міласціны і людскіх прынашэнняў і дароў, адмаўляўся ад падарункаў магутных цароў. Ён працаваў на сваёй невялікай спадчыннай сядзібе, сеяў хлеб і садзіў дрэвы. Сваімі залатымі рукамі ён свае нівы паліваў, сухія галіны са сваіх дрэваў зразаў. Такім чынам, задавальняючыся малым, ён жыў і Аднаму Богу служыў.

Трымаючыся прадпісання “Будзе ў пашане той, хто здавольваецца малым” ён дайшоў да такога стану, што магутныя султаны, навукоўцы і дасведчаныя шэйхі са сталічнага горада Герата прыходзілі за некалькі вёрст на паклон да гэтага вялікага чалавека, цалавалі прах яго парога і тым самым уздымалі галаву свайго гонару да небасхіла.

Усё, што трапляла ў іх рукі з хлеба яго пасеву або з пладоў яго саду, яны, беражліва захоўваючы, адносілі ў горад сваім жонкам і дзецям; тыя, хто еў гэтыя плады, спадзяваліся на выратаванне ў замагільным жыцці. Плады задаволенасці не могуць быць больш дасканалымі, духмянасць пахкага мурогу кветніка радасці не можа быць больш прыемнай.

***Рубаі:***

*Стварыў нямала цудаў Бог на свеце гэтым,*
*Ды добраму не за́сцяць свет багацці свету.*
*Ён шчодра раздае ўсім, хто не папросіць.*
*Не зловіць хцівасць добрага ў сеткі.*

*Давуд Радкевіч*

[30] Маецца на ўвазе прарок Мухамад, мір над ім.

## ГОСТЬ НОМЕРА – АБДУЛЛА МАГОМЕДОВ

*Предлагаем вашему вниманию статьи одного из имамов Минской Соборной мечети, автора сайта* islamdag.ru *и известного дагестанского проповедника Абдуллы Магомедова. Он много пишет, переводит различные статьи и книги, вдумчиво разбирает вопросы семейных и деловых взаимоотношений (имам Абдулла – кадий, шариатский судья нашего Объединения). Его статьи уже публиковались в газете «Жизнь», а сегодня – его дебют в «Байраме». Это статья об исламском взгляде на инвалидность и перевод поучительной истории.*

## Почему рождаются инвалиды?

Многих волнует вопрос, почему Всевышний создаёт инвалидов. Они говорят или думают: «В чём их вина, ведь это несправедливо, получается, что у них нет равных прав с другими?»

В первую очередь этот вопрос связан с верой человека во Всевышнего. Мусульманин, который искренне верит в Аллаха, знает, что Он создал эту Вселенную соразмерно. Он управляет мудро своими делами и делает, что пожелает.

У человека, ведающего это, царит спокойствие в сердце, и у него не возникают сомнения относительно всего того, что происходит вокруг него. Каждый мусульманин должен осознавать, что Всевышний может испытывать своих рабов различными способами, как об этом в Священном Коране говорит Аллах:

وَنَبْلُوكُمْ بِالشَّرِّ وَالْخَيْرِ فِتْنَةً

(смысл): «И Мы испытываем вас тяготой (бедностью, болезнью) и добром (богатством, здоровьем,...) для искушения (чтобы показать, кто проявит терпение и будет благодарным, а кто не вытерпит и проявит неблагодарность)». (Аль-Анбияъ: 35)

Когда мы понимаем, что есть Мудрый Создатель всего и что мы не всё можем постичь разумом, мы просто подчиняемся всем решениям этого Создателя. Например, когда хирург ставит нам диагноз и принимает решение об ампутации, например, руки, на первый взгляд это выглядит очень плохо.

Однако, когда мы узнаём, что если не ампутировать конечность, то болезнь будет прогрессировать, более того, есть опасность летального исхода, мы понимаем, что лучше потерять одну конечность, чем подвергать жизнь и здоровье такой опасности. Таким образом, мы осознаём, что на самом деле это спасение и благо.

Всевышний создал много чего в этом мире. Например, Он создал вредные творения, например, змей, львов, скорпионов. Возможно, кто-то, видя со своей точки зрения только исходящий от них вред, спросит, как и в случае с инвалидами: почему Всевышний создал вредных животных, какая от этого польза? Всевышний – Создатель как добра, так и зла, и в этом есть мудрость Аллаха.

Всевышний Аллах в Коране сказал:

لَا يُسْأَلُ عَمَّا يَفْعَلُ وَهُمْ يُسْأَلُونَ

(смысл): «Всевышнего Аллаха не спрашивают о том, что Он вершит, ибо Он один — Владыка, которому принадлежит всё величие. А вот они (рабы) будут держать ответ и спрошены о том, что делали». (Аль-Анбияъ: 23)

Мы часто размышляем о творениях Всевышнего, чтобы увеличить наш иман, но иногда в конце остаёмся без ответа, так как человеческий разум не может усвоить всей мудрости, заключённой в сотворении Вселенной.

Как бы долго ни размышляли древние мудрецы и учёные, без специальных приспособлений и технический изобретений они не поняли бы, что земля круглая, а не плоская, если бы даже потратили всю жизнь на раздумья.

*Как плоская, истёртая монета*
*На трёх китах покоилась планета.*
*И жгли учёных умников в кострах,*
*Тех, что твердили – дело не в китах.*
(Н. Олев)

В этих строках вы видите, как люди могут быть далеки от истины, независимо от их образованности и багажа знаний.

### Почему же Всевышний создал конкретного человека инвалидом?

Аллах создал людей и испытывает свои творения по-своему, чтоб отличить истинно верующего в Него от неверующего. Посредством таких испытаний можно отличить истинного мусульманина от атеиста и лицемера.

Если спрашивающий является мусульманином, то пусть хорошо познает своего Создателя, если же интересующийся – немусульманин, ему необходимо рассказать о Создателе и о Его качествах, чтоб он понял, что Вселенная не создана попусту, и Он просто так не создаёт ничего.

Да, возможно, это испытание адресовано самому инвалиду, его родителям, родственникам или детям. В основном родители проходят это испытание, ежедневно находясь рядом и видя тяжёлое состояние своего дитя. Таким образом, Аллах испытывает и проверяет их, проявят ли они терпение или нет.

Ребёнок-инвалид на первый взгляд кажется наказанием для родителей, и вполне понятна растерянность родителей, их непонимание: почему? За что? Как жить дальше? Но взглянем на ситуацию иначе.

Семья, воспитывающая ребёнка с особенностями, на какой-то период замыкается в себе, сосредотачиваясь полностью на его проблемах. И вот в этот момент стоит оглянуться и понять, что принёс этот ребёнок в вашу семью.

Отношения между супругами могут перейти на иной уровень, стать крепче, возникнет понимание, что такое семья, что в первую очередь важна забота о детях, их воспитание. Рядом с вами останутся только по-настоящему близкие люди, готовые разделить сложности.

Далее мы приведём поучительный отрывок из коранической истории.

## Мудрость истории, произошедшей между пророками Мусой и Хизри (мир им)

Если же это испытание направлено именно на самого инвалида, возможно, если бы он был полноценно здоровым, то мог впасть в неверие или стать грешником, мы помним историю, случившуюся с Мусой и Хизри (мир им), описанную в суре Аль-Кахф.

Хизри (мир ему) убил маленького ребёнка, и с этим не согласился пророк Муса (мир ему). В священном Коране об этом говорится:

وَأَمَّا الْغُلَامُ فَكَانَ أَبَوَاهُ مُؤْمِنَيْنِ فَخَشِينَا أَنْ يُرْهِقَهُمَا طُغْيَانًا وَكُفْرًا

«А что касается того мальчика, которого я убил, то родители его были верующими, и мы боялись [знали], что оставшись жить, он обречёт своих родителей на беспредельность и неверие (они станут неверующими от любви к нему)». (сура Аль-Кахф: 80).

Иначе говоря, если бы Хизри его не убил, то этот ребёнок стал бы неверующим и стал причиной, которая привела бы его родителей в неверие. В таком случае ребёнку однозначно было лучше покинуть этот свет в детстве. Аллах же изначально знал, что этот ребёнок станет неверующим.

Далее мы приведём хадис, который даст исчерпывающее объяснение данному вопросу:

«Воистину, среди моих рабов есть богатые, если б я их создал бедными, то они впали бы в неверие, для них лучше быть обеспеченными. Есть те, которым лучше быть бедными, если разбогатеют, они станут грешниками. Также есть среди моих рабов больные люди, если бы они были здоровыми, то переступали бы границы дозволенного, для них болезнь принесёт больше блага. Также среди моих рабов есть здоровые, если бы они были больны, то не вытерпели бы этого, для них благо в здоровье». (Табрани, Байхаки).

Воистину, Всевышний испытывает каждого человека по-разному, одного – здоровьем, другого – болезнями, третьего – богатством, четвёртого – бедностью. Испытание может быть направлено как на самого больного, так и на его окружающих, родных и близких.

Если кто-то спросит, зачем нас испытывать, то вспомните, что даже жены проверяют и испытывают своих мужей, а мужья – своих жён, чтобы убедиться, насколько они верны им, хотя у них меньше прав на вторую половину, чем у Всевышнего на своего раба.

أَحَسِبَ النَّاسُ أَنْ يُتْرَكُوا أَنْ يَقُولُوا آمَنَّا وَهُمْ لَا يُفْتَنُونَ

«Неужели люди полагают, что их оставят и не подвергнут испытанию только за то, что они скажут: "Мы уверовали"? (Нет, они непременно будут подвергнуты испытанию Аллаха, чтобы отличились правдивые верующие от лицемеров)». (сура Аль-Анкабут:2).

*Абдулла Магомедов*

## Жадность, которая привела к щедрости

В давние времена жители одного села были известны своей жадностью и скупостью. Они были негостеприимны к тем, кто приезжал в их село, и весть об этом дошла до правителя тех мест. Он обязал жителей этого села проявлять гостеприимство ко всем прибывшим путникам. Он повелел каждому установить свою вешалку в мечети, которую они посещали, и если гость повесит на чью-либо вешалку свою плетку или одежду, то хозяин вешалки должен оказать ему гостеприимство, пригласив домой и накормив его.

Среди жителей села был один очень жадным, и он решил схитрить, отшлифовав и установив вешалку таким образом, чтобы одежда соскальзывала и не держалась на ней, и поставил её в углу мечети.

И вот однажды в мечеть вошёл гость, который слышал о новом законе правителя. Он сказал про себя: «Наверное, эта вешалка самого жадного жителя, так как она установлена отлично от других, он поступил так, желая избежать гостей.

Гость тоже схитрил – он не просто повесил одежду, а накрепко привязал свою чалму к вешалке, чтобы она не упала. Хозяин вешалки, увидев это, очень опечалился.

Когда он грустный пришёл домой, жена спросила: «Что с тобой?» Он ответил: «Беда, которой мы остерегались, постигла нас!». Жена сказала: «Нам придётся проявить *сабр* (терпение), Всевышний нам поможет». Она начала соболезновать ему, а затем собрались его дети, соседи, чтобы поддержать его по этому печальному поводу. По их мнению, угощение гостя было очень затратным делом.

Хозяин зарезал барана, пожарил курицу, заполнил миску похлёбкой и мясом. Жена и дети с соседями стали наблюдать через щель в двери, поджидая, когда придёт гость, и вот стали говорить: «Горе вам, гость идёт!».

Пришёл гость, сел и принялся за еду. Он взял косточку с мясом и лепешку, съел только это, затем вытер руки, воздал хвалу Аллаху и сказал: «Можете всё собрать, да наделит вас Всевышний благодатью».

Хозяин дома говорит:

- Ешь, о раб Аллаха, мы старались ради тебя.

- Я завершил.

- Получается, гость ест, как обычный человек?!

- Да.

- Мы думали, что ты съешь всё, что мы приготовили, и попросишь добавки!

После этой поучительной истории самый жадный человек села стал самым щедрым. Какой бы гость ни прибывал в это село, он принимал его у себя дома и угощал.

*(«Кисас аль-араб», пер. Абдуллы Магомедова)*

# СОРАК ХАДЗІСАЎ У АПАВЯДАННЯХ

*Працягваем публікацыю сарака хадзісаў у апавяданнях для дзяцей. Сёння – дзве гісторыі.*

*Аўтар: прафесар М. Яшар Кандэмір*

*Пераклад: Давуд Радкевіч*

## ГАДАР



У летні дзень на рачным беразе гулялі дзеці. З імі быў хлопчык, якога звалі Гафа́р[31]. За тое, што ён мучыў жывёл, дзеці далі яму мянушку Гада́р[32]. Гафар хацеў гуляць у новыя, яшчэ больш займальныя гульні, але яму не падабалася ні адна з прапанаваных.

Ён адвёў у бок некалькіх сяброў і падбухторыў іх на хітрыкі. Потым ён абвясціў усім, што яны прыдумалі адну цікавую гульню. Дзяцей ахапіла цікаўнасць. А Гафар з сябрамі неўпрыкмет падкраліся да нядаўна пераехаўшага ў горад хлопчыка Алі, які не ўмеў плаваць. Яны схапілі яго за рукі, за ногі, разгайдалі, і з размаху ўкінулі ў рэчку.

Спалоханы Алі боўтаўся ў вадзе, дарэмна спрабуючы выплыць. Ён то апускаўся з галавой, то паказваўся над вадой, прасіў дапамагчы яму, але ўсё гэта толькі выклікала гучны смех Гафара і яго сяброў.

Тут адзін з гледачоў, Ісмаіл стаў хутка скідваць з сябе вопратку. Ён быў адважным хлапчуком, таму толькі ён мог пайсці супраць Гафара. Ісмаіл абурыўся, як толькі ўбачыў ганебны ўчынак. Прайшло не больш за дзве хвіліны, як ён нырнуў у раку і выцягнуў Алі на бераг.

[31] арабск. “Прабачлівы, той, які прабачае”

[32] арабск. “Жорсткі”

Іншыя хлопчыкі пахвалілі Ісмаіла. Сведкам гэтага здарэння стаў выпадковы міна́к[33], добра апрануты чалавек з прыемным тварам.

Ён, пагладзіўшы Ісмаіла па галаве, сказаў: “Дзіця маё, ты выканаў загад нашага Прарока. Хай будзе задаволены табою Аллаг”.

Прарок наш у адным з хадзісаў сказаў:

الْمُسْلِمُ أَخُو الْمُسْلِمِ

لاَ يَظْلِمُهُ ولاَ يُسْلِمُهُ

رواه البخاري

***“Вернік – брат верніку.***
***Ён не зробіць яму злога і не пакіне яго ў руках злачынцаў”***

*Гэты хадзіс перадаў імам аль-Бухары.*

## ПРЫВІД

Адзін купец позняй ноччу вяртаўся дадому. Па дарозе ён убачыў чарнаскурага старога, які збіраўся заначаваць проста пад плотам. Ніхто не прытуліў небараку з-за боязі, што ён можа сваім выглядам напалохаць дзяцей. Купец запрасіў яго ў дом, даў яму гарачай ежы, чыстую бялізну і паклаў спаць у асобным пакоі.

Глыбокай ноччу стары, які спаў ля акна, прачнуўся, разбуджаны незразумелым шумам. Пры слабым святле месяца ён разгледзеў двух рабаўнікоў[34], якія меліся пралезці ўнутр праз акно. Яны думалі забіць купца і выкрасці яго грошы.

Чарнаскуры стары ў адной прасціне ўстаў са свайго ложка і, падняўшы рукі ўверх, крыкнуў:

– Гэй! Што вы тут робіце?

Рабаўнікі, убачыўшы яго, які з’явіўся знянацку, увесь у белым, спалохаліся ад нечаканасці і з воклічамі “Мааамааа!... Тут прывід!” – вываліліся з акна. Адзін паламаў нагу, а другі разбіў сабе галаву. На шум прыбеглі людзі і схапілі рабаўнікоў.

Выдатна сказаў наш Прарок:

[33] Мінак – рус. «прохожий»
[34] рус. грабителей

وَاللهُ في عَوْنِ العَبدِ ما كاَنَ العَبْدُ
في عَونِ أَخِيهِ

رواه مسلم

***“Пакуль чалавек дапамагае свайму блізкаму, Аллаг дапамагае яму”***

*Гэты хадзіс перадаў імам Му́слім.*